РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 МАЯ СЕРАДА № 101 (30489)



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

# НА ВАРЦЕ РУБЯЖОЎ РАДЗІМЫ

**Камандаванню, асабоваму складу, ветэранам органаў пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь**

**Паважаныя таварышы!**

Віншую вас са святам — Днём пагранічніка.

Вы стаіце на варце рубяжоў Радзімы, гатовы ў любую хвіліну першымі прыняць на сябе ўдар ворага. Гэта выбар моцных духам і смелых воінаў — сапраўдных патрыётаў.

Кожны з вас працягвае слаўны шлях герояў пагранічнікаў, якія далі рашучы адпор фашысцкім захопнікам у гады Вялікай Айчыннай вайны, герояў, якія здзейснілі подзвігі ў мірны час.

Сёння на граніцы неспакойна. Абарона Айчыны ў перыяд глабальнай геапалітычнай нестабільнасці патрабуе ад нас максімальнай засяроджанасці на пагрозах і мерах па забеспячэнні бяспекі. Мы ўзводзім новыя пагранічныя рубяжы, абсталяваныя сучаснымі тэхнічнымі сродкамі аховы, забяспечваем пагранічную службу найноўшымі ўзорамі ўзбраення і баявой тэхнікі, робім усё, каб захаваць чыстае неба над роднай Беларуссю.

Абсалютна перакананы, што мірны сон нашых грамадзян ахоўваюць прафесіяналы найвышэйшага ўзроўню, верныя абавязку і адданыя сваёй краіне.

Дзякую за службу ветэранам, дзейным ваеннаслужачым і цывільнаму персаналу. У гэты святочны дзень жадаю вам і вашым сем'ям моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

ВЫРАСЦІЦЬ ЭКАЛАГІЧНА ЧЫСТУЮ ГАРОДНІНУ НА ЎЛАСНЫХ ГРАДКАХ 13



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X
25101

ЗАНЯТАСЦЬ

## КАНІКУЛЫ З КАРЫСЦЮ

**Як школьнікам і навучэнцам падзарабіць улетку?**



Трэнд апошніх гадоў — жаданне маладых людзей працаўладкавацца ў вольны ад вучобы час. Напрыклад, летась, паводле даных Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, падчас канікулаў працавала больш за 55 тысяч хлопцаў і дзяўчат, у асноўным непаўналетніх. Адчуўшы такі запыт, дзяржаўныя службы прынялі шэраг мер, якія дазваляюць маладым людзям хутка знайсці месца часовай падпрацоўкі і зарабіць уласныя грошы. Актуальны на сёння пералік арганізацый прапануе юнакам і дзяўчатам 18,4 тысячы вакансій, з іх 9,6 тысячы — для непаўналетніх. Расказваем, якую падпрацоўку на лета можна знайсці і як гэта зрабіць.

СТАР. 6

АКЦЭНТЫ

# ДВУХБАКОВЫ ПАРАДАК ДНЯ І ЎДЗЯЧНАСЦЬ ЗА ДАПАМОГУ Ў АБМЕНЕ ПАЛОННЫМІ

**Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр ЛУКАШЭНКА і Уладзімір ПУЦІН вечарам 26 мая правялі тэлефонную размову, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара**



Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі актуальныя пытанні двухбаковага беларуска-расійскага парадку дня, а таксама міжнародную абстаноўку.Акрамя таго, Прэзідэнт Расіі падзякаваў беларускаму калегу за аказанае садзейнічанне і дапамогу ў арганізацыі працэсу абмену палоннымі «тысяча на тысячу» — у развіццё дамоўленасцяў, дасягнутых у Стамбуле.

## «БЕЛАРУСЬ ГАТОВА ПАДТРЫМЛІВАЦЬ ДЫЯЛОГ І ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ УСЕ МАГЧЫМЫЯ СРОДКІ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ДАМОЎЛЕНАСЦЯЎ»

**Па просьбе карэспандэнтаў «Звязды» размову двух лідараў пракаменціравалі эксперты**



Як падкрэсліў **старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў, доктар ваенных навук Мікалай БУЗІН**, на працягу доўгага часу Беларусь застаецца надзейным саюзнікам Расійскай Федэрацыі. «Мы выконваем усе ўзятыя на сябе абавязацельствы, — адзначыў ён. — Гэта датычыцца і тых узаемаадносін, якія ёсць на сёння паміж Расіяй і Украінай. У прыватнасці, усе абмены ваеннапалоннымі, загінулымі бакоў канфлікту ажыццяўляліся і ажыццяўляюцца на тэрыторыі Беларусі».

Пры гэтым дэпутат акцэнтаваў увагу на тым, што Мінск не выстаўляе сябе ў якасці пляцоўкі для перагавораў.

> **«Мы не з'яўляемся пасрэднікамі і не бяром на сябе гэту місію, — канкрэтызаваў ён. — Аднак мы застаёмся каналам камунікацыі паміж Украінай і Расіяй, забяспечваем па меры магчымасці ўсе неабходныя дзеянні, рашэнні складаных пытанняў».**

Па словах Мікалая Бузіна, Рэспубліка Беларусь чарговы раз даказвае сваю гатоўнасць і здольнасць да кампрамісаў, гатоўнасць да вырашэння любых праблемных задач шляхам перагавораў. Ён заўважыў, што невыпадковы словы ўдзячнасці, выказаныя Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі ў адрас беларускага лідара, прагучалі менавіта пасля рэалізацыі найсур'ёзнейшага этапу абмену — двухбаковага абмену «тысяча на тысячу». Гэта вельмі цяжкі працэс, які дзякуючы падтрымцы і ўсебаковаму забеспячэнню з боку Беларусі быў рэалізаваны паміж дзяржавамі, што ваююць. Расійскі лідар гэта цэніць і разумее, у адрозненне ад Зяленскага, а вярнулі ж і ўкраінскіх ваеннапалонных.

Парламентарый канстатаваў, што Беларусь — краіна, якая з'яўляецца гарантам міру ў нашым рэгіёне. «Краіна, якая гатова падтрымліваць дыялог і забяспечыць усе магчымыя сродкі для рэалізацыі двухбаковых дамоўленасцяў, — дадаў старшыня пастаяннай камісіі. — Беларусь — не пасрэднік. Беларусь — саюзнік і партнёр для большасці дзяржаў».



Па словах **дэкана факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдата гістарычных навук, палітолага Аляксея БЯЛЯЕВА**, сам факт размовы сведчыць аб глыбокім даверы паміж двума лідарамі, аб скаардынаванай палітыцы, якую праводзяць Прэзідэнты Беларусі і Расіі, што з'яўляецца паказчыкам вельмі блізкага, цеснага супрацоўніцтва. «Тэлефонная размова прэзідэнтаў краін, якія ўваходзяць у адно дзяржаўнае аб'яднанне — Саюзную дзяржаву Беларусі і Расіі, дэманструе, наколькі такое аб'яднанне сёння запатрабавана, — удакладніў ён. — Пры гэтым мы бачым, што лідар Расійскай Федэрацыі знаёміць нашага Прэзідэнта з асноўнымі кірункамі сваіх палітычных дзеянняў на знешнім контуры. Такі абмен інфармацыяй вельмі важны, паколькі Беларусь з'яўляецца паўнавартасным удзельнікам усіх міжнародных адносін і мае права атрымліваць ад найбліжэйшага саюзніка, Расійскай Федэрацыі, самую вычарпальную інфармацыю».

Вельмі важным момантам, як заўважыў Аляксей Бяляеў, з'яўляецца тое, што ў размове Уладзімір Пуцін выказаў удзячнасць нашаму Прэзідэнту за аказанне прамой дапамогі ў абмене ваеннапалоннымі, які адбыўся на беларускай зямлі.

> **«Гэта ўжо не першы выпадак, што пацвярджае: Рэспубліка Беларусь, наша кіраўніцтва і асабіста Прэзідэнт напрамую ўцягнуты ў працэсы палітычнага ўрэгулявання вакол Украіны. Кіраўнік дзяржавы неаднаразова паўтараў, што ён гатовы прадаставіць тэрыторыю краіны для вядзення перагаворнага працэсу і стварыць любыя ўмовы, толькі б гэта вайна спынілася.**

Гэта сведчыць аб тым, што беларусы выступілі не проста назіральнікамі, а ўдзельнікамі працэсу абмену ваеннапалоннымі. І падкрэслівае, што ў нашых дзвюх краін, Беларусі і Расіі, ёсць вельмі сур'ёзныя кантакты і ўзаемадзеянне на ўзроўні шматлікіх службаў па праблемах, звязаных з украінскім канфліктам», — адзначыў палітолаг.

Дэкан факультэта журналістыкі БДУ звярнуў увагу на тое, што ў размове паміж лідарамі закраналіся самыя розныя аспекты сучасных міжнародных і геапалітычных адносін. «Нягледзячы на тое, што дэталі размовы не агучваліся, гэта кароткае ўпамінанне сведчыць аб тым, што і ў Беларусі, і ў Расіі ўзгодненая знешняя палітыка, не робяцца спробы абысці, у прыватнасці, Беларусь, пакінуўшы нас сам-насам са сваімі праблемамі, — канкрэтызаваў Аляксей Бяляеў. — Мы ведаем, што, напрыклад, пытанні санкцыйнага ціску сёння разглядаюцца пакетна: еўрапейцы і Злучаныя Штаты ўключаюць у адзін пакет і Беларусь, і Расію. Супрацьстаяць санкцыйнаму ціску мы таксама павінны разам. Гэты момант таксама вельмі важны. Вядуцца размовы, што тыя ці іншыя заходнія кампаніі хочуць вярнуцца на расійскі рынак. У дадзеным выпадку павінна ставіцца пытанне аб вяртанні да эканамічнай дзейнасці і ў Рэспубліцы Беларусь».



**Член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Вадзім ГІГІН** перакананы, што тэлефонная размова двух Прэзідэнтаў — найважнейшая падзея ў ходзе ўсяго працэсу, звязанага з развіццём украінскага крызісу і, галоўнае, спробамі яго ўрэгулявання. «Беларусь і Расія працягваюць цесна каардынаваць свае дзеянні, — канстатаваў дэпутат. — Варта яшчэ раз падкрэсліць: ніякія дамоўленасці па Украіне не могуць быць дасягнуты, а тым больш рэалізаваны без уліку інтарэсаў нашай краіны. І Расія, у тым ліку асабіста Уладзімір Уладзіміравіч Пуцін, актыўна падтрымлівае гэту пазіцыю».

Па словах парламентарыя, роля Беларусі ў арганізацыі і ажыццяўленні найбуйнейшага абмену палоннымі паміж Расіяй і Украінай — пераканаўчае сведчанне рэзультатыўнасці беларускага ўдзелу. «Столькі палонных — людзей, многія з якіх маюць сур'ёзныя праблемы са здароўем, — удакладніў ён. — Дадайце каласальны недавер супрацьлеглых бакоў. І пры гэтым усё было арганізавана дакладна і зладжана».

Вадзім Гігін падкрэсліў, што беларусы не напрошваюцца ў пасрэднікі.

«Але мы ж блізкія людзі, знаходзімся зусім побач, а не недзе за акіянам, — сказаў ён. — Ды і само жыццё пацвярджае: без Беларусі дасягнуць урэгулявання, а ўжо тым больш дабіцца міру ва Украіне будзе, мякка кажучы, складана. І яшчэ адзін момант. Наколькі больш выйгрышна выглядае ўзгодненая знешнепалітычная лінія, якая праводзіцца ў Саюзнай дзяржаве, у параўнанні з тым разладам, што пануе ў «еўраатлантычнай супольнасці».

Там сварка за сваркай. А ў нас усё этычна, ветліва, па-сяброўску, па-таварыску, па-братэрску».



**Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Сяргей КЛІШЭВІЧ** выказаў меркаванне БелТА, што, калі ў Белгародскай вобласці зімой 2024 года быў збіты расійскі борт Іл-76 з украінскімі ваеннапалоннымі, якія перадаваліся ў рамках абмену, быў пачаты пошук больш бяспечнага варыянту трансферу ў далечыні ад лініі баявога сутыкнення. «Беларусь тут ідэальная ў плане лагістыкі, аператыўнасці, мінімальных затрат і стыку агульнай граніцы з дзвюма дзяржавамі, — канстатаваў ён. — І мы бачым, што практычна ўсе абмены апошніх месяцаў паспяхова адбываюцца на зямлі, з выкарыстаннем аўтобуснай тэхнікі. Беларусь як удзельнік і арганізатар працэсу неаднаразова даказала, што гарантуе ўсім удзельнікам абмену бяспеку».

Па словах дэпутата, для нашай краіны гэта значная вяха і ў дыпламатыі. «Пасля перадачы буйных партый ваеннапалонных будзе адноўлены перагаворны працэс, які раней ішоў у Стамбуле, — заўважыў парламентарый. — У прыватнасці, чакаецца, што Кіеву будзе перададзены расійскі мемарандум аб завяршэнні ваеннага канфлікту. Такім чынам, наша краіна, як і раней, садзейнічае ўстанаўленню міру. Беларусь ужо агульнапрызнана стала донарам міру, дзяржавай, якая ўсяляк спрыяе ўрэгуляванню канфліктаў у нашым рэгіёне. Тым больш што гаворка ідзе пра нашы братэрскія народы. Не навязваючыся ў міратворцы, мы гатовы рабіць усё, каб дзеці, жонкі, маці хутчэй убачылі сваіх бацькоў, мужоў і сыноў. Абмен палоннымі пры нашым садзейнічанні дае надзею, што славянскія народы самі змогуць паміж сабой дамовіцца. Чаго насамрэч жадаюць заходнія «міратворцы», мы, на жаль, неаднаразова бачылі.

> **Вядома, прыемна, што ўнёсак Беларусі ацэнены Расійскай Федэрацыяй: Уладзімір Пуцін у тэлефоннай размове падзякаваў беларускаму лідару за аказанае садзейнічанне і дапамогу ў арганізацыі працэсу абмену палоннымі. Разам з тым для Зяленскага гэта, напэўна, не з'яўляецца важнай падзеяй. І пакуль слоў падзякі Беларусі ад Украіны не паступала».**

Вераніка КАНЮТА.

# НОВЫ ПАРАДАК РАБОТЫ АЎТАПАРКОВАК І СТАЯНАК

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 27 мая падпісаў Указ № 218, якім уносяцца змяненні ва Указ ад 3 кастрычніка 2006 года № 589 «Аб упарадкаванні работы аўтамабільных стаянак і аўтамабільных паркovak», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Дакументам, у прыватнасці, удакладняюцца ўмовы арганізацыі і ўтрымання аўтапарковак, за карыстанне якімі будзе брацца плата, выключаецца абавязковая ўмова па аснашчэнні платных парковак устройствамі па ўліку часу і разліку платы, а таксама тэхнічнымі сродкамі, што перашкаджаюць выезду транспартнага сродку (ТС) з паркоўкі ў выпадку неўнясення платы.

Указам вызначаюцца катэгорыі транспартных сродкаў, плата за паркоўку якіх не бярэцца. Да іх аднесены ТС аператыўнага прызначэння, а таксама тыя, што выкарыстоўваюцца ў мэтах забеспячэння абараназдольнасці, правапарадку, ліквідацыі надзвычайных сітуацый, аказання медыцынскай дапамогі (у тым ліку хуткай медпамогі), нацыянальнага аператара паштовай сувязі і іншыя.

Аўтамабільныя паркоўкі, размешчаныя на рынках, каля гандлёвых аб'ектаў і аб'ектаў сацыяльна-культурнага прызначэння, застаюцца бясплатнымі.

Указ накіраваны на змяншэнне транспартнай і экалагічнай нагрузкі на цэнтральныя часткі гарадоў, павышэнне эфектыўнасці функцыянавання паркавачнай прасторы і плацежнай дысцыпліны аўтаўладальнікаў у частцы карыстання паркоўкамі.




Парадак работы аўтамабільных парковак і стаянак, а таксама спагнання платы за іх будзе вызначаны Саветам Міністраў.

Нормы ўказа ў частцы ўвядзення новага парадку работы аўтапарковак і стаянак уступаюць у сілу праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ПАТЭНЦЫЯЛ РОСТУ

## Беларусь — Татарстан: раскрыць новыя інтарэсы для ўзаемадзеяння

**Сёння Беларусь шчыльна супрацоўнічае з расійскімі рэгіёнамі. Сярод іх — Татарстан. Адзін з самых эканамічна развітых суб'ектаў Расіі, які днямі наведала ўрадавая дэлегацыя на чале з Прэм'ер-міністрам Аляксандрам ТУРЧЫНЫМ. Візіт аказаўся вельмі насычаным: за адзін дзень — тры гарады. Як кажуць, «наступствы» ад візіту — вачыма яго ўдзельнікаў.**

Казань — сталіцу Татарстана — называюць трэцяй сталіцай Расіі, але ўвагі заслугоўвае ўся рэспубліка. Буйная агламерацыя аб'ядноўвае Ніжнякамск, Елабугу і Набярэжныя Чаўны, у якіх і пабывалі ўдзельнікі ўрадавай дэлегацыі. Чаму менавіта гэтыя гарады? Усё вельмі проста — у іх межах сканцэнтраваны асноўныя прамысловыя магутнасці Татарстана.

Важным момантам цяперашняга візіту можна назваць асабісты ўдзел у наведванні кожнага прадпрыемства (і прадстаўленне магчымасцяў кааперацыі) кіраўніка рэспублікі Рустама Мініханава.

«МТЗ-Татарстан» на рынку ўжо больш за два дзясяткі гадоў. Таму наш трактар тут у асаблівым прадстаўленні не мае патрэбы. Яго тут добра ведаюць і вельмі паспяхова выpaбляюць.

У свой час усё пачыналася са звычайных продажаў, але потым вырашылі стварыць вытворчасць тут, на месцы — гэта зручна і выгадна. З пачатку рэалізацыі праекта ўжо сабралі амаль 25 тысяч трактароў — нямала. І паказчыкі працягваюць расці з кожным годам, але, як той казаў, няма мяжы дасканаласці. Бо ў часы імпартазамяшчэння важна быць на крок наперадзе. Таму бакі дамовіліся аб павелічэнні ўзроўню лакалізацыі на расійскім рынку.

Ёсць і прыклады кааперацыі беларускіх вытворцаў з расійскімі прадпрыемствамі. Яскравы таму прыклад — ПАТ «КАМАЗ», з якім беларусы падчас цяперашняга візіту падпісалі кантракты на некалькі мільёнаў долараў. І ўсё гэта — насуперак (хоць можна сказаць і дзякуючы) заходнім санкцыям, якія толькі падштурхнулі да паглыблення супрацоўніцтва.

Трэба сказаць, што ў 2022-м КАМАЗ удалося хутка перабудавацца, у тым ліку дзякуючы супрацоўніцтву з нашымі прадпрыемствамі. Напрыклад, БАТЭ і холдынг «Аўтакампаненты» пастаўляюць адразу 17 відаў камплектуючых.

А наогул у партнёрах адразу два дзясяткі брэндаў. Усё той жа МАЗ, а яшчэ БМЗ, «Гарызонт» і «Пажснаб» — кожны адказвае за сваю нішу і заключае новыя ўзаемавыгадныя кантракты.

Як расказаў **дырэктар холдынга «Гарызонт» Юрый ПРАДКО**, супрацоўніцтва з КАМАЗам наладжана ўжо на працягу некалькіх гадоў:

— Уласна наш кірунак — гэта электроніка, кіраванне электронікай. А сучасныя аўтамабілі без электронікі сёння існаваць не могуць. Вельмі важнае пытанне — дапамога кіроўцу:



гэта разумнае кіраванне, кіраванне выкарыстаннем інтэлекту. Мы сёння падпісалі кантракт на некалькі мільёнаў долараў, каб быць у трэндзе на рынку.

У ліку тых, хто па выніках візіту папоўніў партфель кантрактаў, **дырэктар барысаўскага прадпрыемства «Пажснаб» Алег ДЗЯРАБІН**. Ён паведаміў, што супрацоўніцтва з КАМАЗам таксама наладжана досыць даўно:

— Мы працуем з КАМАЗам вельмі шчыльна па вырабе машын — пажарных і аварыйна-ратавальных. І цяпер падпісалі дагавор, пагадненне аб пачатку супрацоўніцтва па распрацоўцы новага мадэльнага шэрага з кампаніяй «Рэмдызель», якая з'яўляецца стратэгічным партнёрам КАМАЗа. І мы хочам сёлета завяршыць распрацоўку і пастаноўку на вытворчасць пажарных машын новага пакалення на базе К5, аўтамабіляў маркі КАМАЗ.

Яшчэ адна перспектыўная тэма ў нашым супрацоўніцтве — нафтахімія. Пра тое, чым яшчэ можам быць карысныя адзін аднаму, гаварылі на пляцоўцы прадпрыемства «Танека» — гэта «дачка» вядомай «Татнафты». Чаму менавіта дадзеная сфера прываблівая? Істотная частка ўзаемнага тавараабароту — вынік развіцця кааперацыйных сувязяў паміж прадпрыемствамі менавіта нафтахімічнага комплексу. Аснова супрацоўніцтва — узаемадапаўняльныя пастаўкі хімічнай сыравіны. Акрамя таго, «Татнафта» стварыла ў Беларусі сетку з 18 АЗС.

Пра тое, што наша краіна застаецца адным з ключавых гандлёвых партнёраў Татарстана, казаў на сустрэчы з беларускім Прэм'ер-міністрам і Раіс Татарстана Рустам Мініханаў, паведамляе прэс-служба Раіса РТ.

— Прэзідэнты нашых краін актыўна падтрымліваюць развіццё сувязяў на ўзроўні рэгіёнаў. Падчас кожнага нашага візіту ў Мінск мы сустракаемся з Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам, ён заўсёды знаходзіць час. Мы ўдзячныя за ўвагу да супрацоўніцтва з нашай рэспублікай. Вялікім гонарам для нас сталі леташнія візіты ў Татарстан Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь для ўдзелу ў цырымоніі адкрыцця Гульняў будучыні і ў рабоце саміту БРІКС, — адзначыў Рустам Мініханаў.

Паводле яго слоў, краіны звязваюць даўнія і ўстойлівыя адносіны, падмацаваныя пагадненнямі паміж міністэрствамі, муніцыпалітэтамі, гандлёва-прамысловымі палатамі, акадэміямі навук, прадпрыемствамі. Развіваюцца міжпарламенцкія сувязі. Каардынацыю ўзаемадзеяння ажыццяўляе сумесная рабочая група. Падтрыманню актыўнага супрацоўніцтва спрыяюць прамыя авіярэйсы паміж Казанню і Мінскам.

Рустам Мініханаў адзначыў гандлёвыя сувязі, якія дынамічна развіваюцца. Летась тавараабарот, паводле ацэнак расійскага боку, наблізіўся да 750 мільёнаў долараў.

— Наша мэта — давесці аб'ём узаемнага гандлю да 1 мільярда долараў. Для гэтага ёсць усе магчымасці. Нашы таваравытворцы, прамыслоўцы адзін аднаго добра ведаюць. Але нам трэба раскрыць новыя інтарэсы для нашых бакоў. Кірунакаў вельмі шмат, — рэзюмаваў ён.

МІЖНАРОДНЫ ВЕКТАР

# СУМЕСНЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ І МІЖПАРЛАМЕНЦКІЯ СУВЯЗІ



Фота БелТА.

**Працягваецца афіцыйны візіт беларускай дэлегацыі на чале са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Ігарам СЕРГЯЕНКАМ у Егіпет. У ходзе візіту прайшоў шэраг двухбаковых сустрэч.**

Падчас сустрэчы са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Арабскай Рэспублікі Егіпет Ханафі Алі аль-Гебалі Ігар Сергяенка звярнуў увагу на тое, што ў галіне эканамічных адносін Беларусь імкнецца не толькі да росту, але і да збалансаванасці гандлю за кошт павелічэння закупак з Егіпта тавараў крытычнага імпарту, падкрэсліўшы, што ў мэтах забеспячэння харчовай бяспекі Егіпта Беларусь гатова да стварэння ў гэтай краіне зборачнай вытворчасці.

Адзначана зацікаўленасць у партнёрстве з Егіптам у арганізацыі сумесных вытворчасцяў у перспектыўных галінах, у тым ліку ў сферы водаачысткі. Таксама абмяркоўваліся пытанні стварэння сумесных прадпрыемстваў, супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы. Рэзюмуючы, Ігар Сергяенка падкрэсліў, што беларуска-егіпецкае супрацоўніцтва мае сур'ёзныя перспектывы.

Падчас перагавораў з намеснікам старшыні Арабскага парламента Тарыкам Насырам гаворка ішла аб нарошчванні міжпарламенцкіх сувязяў з арабскімі краінамі, а таксама мірных ініцыятывах Беларусі. Ігар Сергяенка прапанаваў вызначыць шэраг перспектыўных, выгадных праектаў узаемадзеяння Беларусі з Арабскім парламентам, якія маглі б стаць своеасаблівым лакаматывам развіцця адносін.

У ходзе сустрэчы з міністрам інвестыцый і міжнароднага гандлю Арабскай Рэспублікі Егіпет Хасанам эль-Хацібам бакі падкрэслілі зацікаўленасць у нарошчванні аб'ёмаў і пашырэнні наменклатуры паставак беларускай прадукцыі ў Егіпет, у тым ліку для рэалізацыі на тэрыторыі афрыканскай краіны інфраструктурных праектаў.

Таксама ў рамках візіту ў Егіпет адбылася сустрэча спікера і прадстаўнікоў дзелавых колаў Беларусі з намеснікам Прэм'ер-міністра, міністрам прамысловасці і транспарту Егіпта Камелем аль-Вазірам. Бакі дамовіліся паскорыць падпісанне Дарожнай карты па развіцці супрацоўніцтва ў сферы прамысловасці паміж краінамі.

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**

# ДОПОЛНЕНИЕ И ИЗМЕНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

**по объекту «Возведение многоквартирного жилого дома по ул. Каролинской в г. Минске»,**
***опубликованной в газете «Звязда» от 03.05.2025 № 85 (30473)***

**Застройщик:** коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 05.01.2015 за № 192400611.

**Юридический адрес и местонахождение предприятия:** 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 4-107, тел./факс (017) 234-16-99.

**Офис продаж:** 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 6, офис 213, тел.: (017) 234 16 98, (044) 795 44 44, (044) 559 33 91.

**Режим работы офиса продаж:** понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15, обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

**Цель строительства** – строительство многоквартирного жилого дома по ул. Каролинской в г. Минске.

**Сведения об этапах и сроках строительства:**

Срок начала строительства жилого дома – июль 2024 года.

Нормативная продолжительность строительства – 23 месяца.

Предполагаемый срок завершения застройщиком строительства жилого дома и ввода его в эксплуатацию – 3-й квартал 2026 года.

Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются 36 квартир без выполнения внутренних отделочных работ на 7-8 этажах, в том числе:
- 24 однокомнатные квартиры общей площадью от 34,54 до 34,89 кв. м;
- 12 двухкомнатных квартир общей площадью от 59,87 до 62,29 кв. м.

| Квартиры | Площадь квартиры, кв. м | Стоимость 1 кв. м площади квартиры, бел. руб. | Стоимость 1 кв. м площади кладового помещения, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1-комнатные (7-8 этаж) | 34,54–34,89 | 5 900 | 3 000 |
| 1-комнатные (7-8 этаж) окна во двор (квартиры № 85-90, 103-108) | 34,54–34,89 | 5 700 | |
| 2-комнатные (7-8 этаж) | 59,87–60,04 | 4 900 | |
| 2-комнатные (7-8 этаж) окна во двор (квартиры № 73, 84, 91, 102) | 62,29 | 4 700 | |

**Договор создания объекта долевого строительства заключается только с учетом приобретения жилого помещения или жилого помещения с кладовой. Отдельно на кладовое помещение договор не заключается.**

**Условия оплаты**:

первоначальный взнос в размере **30 % стоимости** объекта долевого строительства в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – ежемесячно до конца строительства в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства.

**Документы** для заключения договоров создания объектов долевого строительства **будут приниматься и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди с 8.30 03.06.2025 года** до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего задекларированному количеству объектов долевого строительства, **по адресу: г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213 (офис продаж).**

**Для подачи заявления и заключения договора необходимо наличие:**

для физических лиц – паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность); доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке;

для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – документа, подтверждающего полномочия представителя, паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность) представителя, копии свидетельства о государственной регистрации и Устава.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и государственное предприятие «Управление капитального строительства Запад» оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации.

УНП 192400611

# Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 120/С-15908 (наименование: **столярный цех;** назначение: **здание обрабатывающей промышленности иного назначения)** площадью 424,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Берёзовский р-н, г. Берёза, ул. Ленина, 100, на земельном участке с кадастровым номером 120850100001002809 площадью 0,3581 га, составные части и принадлежности: четыре пристройки

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 102 900,00 | Размер задатка, руб. | 10 290,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Теплоприбор», 225209, Брестская обл., г. Береза, ул. Ленина, 100, тел. 80164341970. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 01 июля 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 30 июня 2025 г. до 17.00**

З НАГОДЫ

# АХОВА ГРАНІЦЫ І ПРАВАПАРАДКУ

## Асаблівасці службы пагранічнікаў у зоне адчужэння

Пагранічная застава «Нароўля» ахоўвае каля 60 км дзяржаўнай граніцы з Украінай на тэрыторыі Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка. Сярод асаблівасцяў участка — зона адчужэння, паўнаводная рака Прыпяць і шырокая забалочаная мясцовасць. Мы адправіліся туды, каб даведацца пра асаблівасці службы на гэтым участку.



### СПЕЦСРОДКІ ДЛЯ БЯСПЕКІ

Без спецыяльнай экіпіроўкі, тэхнічных сродкаў і транспарту туды не трапіш. Перад уездам у зону радыяцыйнага забруджвання выдаецца галаўны ўбор, акуляры, пальчаткі, рэспіратар, спецкасцюм і боты. У экіпіроўку ўваходзяць пошукавы дазіметр, радыёстанцыя, ліхтар і індывідуальная аптэчка. Акрамя таго, кожны вайсковец мае дазіметр для вымярэння назапашанага асабіста ім узроўню радыяцыі.

Для бяспечнага нясення службы ў зоне адчужэння падраздзяленне аснашчана аўтамабілямі высокай праходнасці з цеплавізарамі. Такі транспарт дазваляе пагранпараду перамяшчацца па бездаражы і весці бесперапыннае назіранне незалежна ад часу сутак. Акрамя таго, аўтамабілі абсталяваны сістэмай кандыцыянавання — каб радыеактыўны пыл не трапіў у салон.

Маніторынг участку «Нароўлі» ажыццяўляецца і з дапамогай беспілотнікаў. Яны істотна эканомяць час на агляд мясцовасці і скарачаюць перыяд знаходжання людзей у небяспечнай зоне.

У распараджэнні вартавых граніцы ёсць і мабільная радыелагічная лабараторыя. З яе дапамогай можна выявіць перавышэнне радыяцыйнага фону ў выпадку спробы нелегальнага вывазу прадметаў з тэрыторыі запаведніка. Таксама лабараторыю выкарыстоўваюць з мэтай дазіметрычнага абследавання асабовага складу і мясцовага насельніцтва.

ПАТРЫЯТЫЧНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

# МАРШАМ ПЕРАМОГІ

## Акцыя Узброеных Сіл стартавала ў Сянно




Яна пройдзе ў шасці гарадах, якія сёлета ўзнагароджаны вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны». Сёння акцыя працягнецца ў Рэчыцы, 31 мая — у Слоніме, 1 чэрвеня — у Кобрыне, 6-га — у Слаўгарадзе. Завершыцца маштабны патрыятычны праект Міністэрства абароны 7 чэрвеня ў Смалявічах.

На пляцоўках гарадоў будуць выстаўлены танкі Т-34-85, якія сёлета ўдзельнічалі ў парадзе войск Мінскага гарнізона 9 Мая. Запланаваны выступленні ваенных аркестраў і кіналагаў са службовымі сабакамі, адбудзецца выстава стралковай зброі. Асабовы склад сіл спецыяльных аперацый прадставіць паказальныя выступленні з элементамі рукапашнага бою. Прадстаўнікі ваенных навучальных устаноў правядуць прафарыентацыйную работу.

— Акцыя «Марш Перамогі» праводзіцца з мэтай увекавечання гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа, а таксама дзеля патрыятычнага выхавання насельніцтва, пачынаючы з самых юных беларусаў, — адзначае **начальнік 2-га аддзела ўпраўлення інфармацыі Міністэрства абароны палкоўнік Аляксандр КІСЕЛЬ.**

Сянно стала першым у маршруце «Марша Перамогі», дзе днямі сустракалі легендарныя танкі Т-34. Ваеннаслужачыя падрыхтавалі для жыхароў горада выставу ўзбраення і ваеннай тэхнікі, экіпіроўкі. Прадстаўнікі Ваеннай акадэміі Беларусі і ваенных факультэтаў грамадзянскіх ВНУ расказалі гасцям мерапрыемства аб спецыяльнасцях і ўмовах паступлення ва ўстановы адукацыі краіны. Жыхары і госці горада не ўпусцілі моманту зрабіць фотаздымкі на фоне танкаў Т-34. Усе ахвотныя пачаставаліся смачнай салдацкай кашай і гарачай гарбатай.



Па словах **намесніка начальніка Заслонаўскага гарнізона па ідэалагічнай рабоце палкоўніка Вячаслава АКАВІЦКАГА**, акцыя стала маштабнай падзеяй. «Натуральна, яна прыцягнула ўвагу вялікай колькасці насельніцтва, у тым ліку дзяцей, — удакладняе ён. — Жыхарам была дадзена магчымасць не толькі ўбачыць танкі з экранаў тэлевізара або непасрэдна падчас парада, а і дакрануцца да легендарнай тэхнікі. Важнае мерапрыемства нагадвае аб мужнасці і самаахвярнасці нашых ветэранаў, якія прымалі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне. Гэта яшчэ і адказ на шматлікія спробы сказіць гісторыю. Сянно — той горад, дзе на першапачатковым этапе вайны разгортваліся жорсткія баі. Акрамя танкаў Перамогі, падчас акцыі была прадстаўлена і сучасная тэхніка — гэтым самым мы прадэманстравалі цяперашнія магчымасці нашых Узброеных Сіл».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота прэс-службы Мінабароны.**



## НА 50 КІЛАМЕТРАЎ УГЛЫБ КРАІНЫ

Гаворачы аб асаблівасцях службы на гэтым участку дзяржграніцы, начальнік пагранічнай заставы «Нароўля» маёр Раман Сташэвіч адзначае, што падраздзяленне кантралюе вялізную тэрыторыю — на 50 км углыб краіны. Трэба адзначыць, што менавіта на забруджаную мясцовасць выязджаюць толькі кантрактнікі. Пры гэтым усе яны далі згоду на праходжанне службы ў асаблівых умовах. Афіцэр падкрэслівае: для вайскоўцаў «Нароўлі» абавязкова штогадовае праходжанне паглыбленай медыцынскай камісіі.

— У кожнага з нас ёсць індывідуальныя дазіметры, — расказвае Раман Сташэвіч. — Штодня іх паказчыкі фіксуюцца. Застава ахоўвае дзяржаўную граніцу з 2018 года. За мінулы перыяд дзякуючы выкананню мер бяспекі і асаншчэнню не было ніводнага выпадку пагаршэння стану здароўя вайскоўцаў або перавышэння дапушчальных доз радыяцыйнай нагрузкі.

Яшчэ адной адметнасцю ўчастка заставы з'яўляецца вялікая колькасць «адселеных» пасля аварыі на ЧАЭС беларускіх вёсак. Гэта шырокія тэрыторыі, якія заўсёды знаходзяцца пад кантролем пагранічнікаў.

На працягу ўсяго года пропуск асоб у запаведнік строга абмежаваны. Выключэнне — супрацоўнікі спецыяльных арганізацый. Аднак у перыяд рэлігійных свят пропуск на тэрыторыю ўсё ж ажыццяўляецца — для наведвання месцаў пахавання.

## БРАКАНЬЕРЫ І СТАЛКЕРЫ

Начальнік заставы расказаў, што здараюцца разнастайныя выпадкі парушэння заканадаўства: ад незаконнай лоўлі рыбы і палявання на тэрыторыі запаведніка да вывазу з апусцелых населеных пунктаў металаў і маёмасці, пакінутай жыхарамі ў сваіх дамах. Асноўным матывам парушэнняў афіцэр называе атрыманне прыбытку. Як правіла, падобныя спробы адбываюцца ўвесну і ўлетку ў перыяд нерасту рыбы і міграцыі жывёл. Зімой колькасць парушэнняў зніжаецца. Нараўне з браканьерамі пагранічнікі затрымліваюць і сталкераў, якія дзеля атрымання вострых адчуванняў пранікаюць на тэрыторыю адселеных пунктаў.

Пагранічнікі «Нароўлі» спыняюць парушэнні заканадаўства не толькі кругласутачным кантролем нарадаў і тэхнічных сродкаў. Дапамагаюць вайскоўцам і мясцовыя жыхары. Яны адразу ж паведамляюць на заставу аб з'яўленні невядомых.

— У першую чаргу наша задача — ахова дзяржаўнай граніцы, у другую — падтрыманне правапарадку. Кожны з нас усведамляе вялікую адказнасць службы на ўчастку, размешчаным у межах тэрыторыі Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка і побач з непрадказальнымі суседзямі. У нас ёсць усё неабходнае для выканання задач, дзякуючы чаму гарантаванне пагранічнай бяспекі ажыццяўляецца эфектыўна і бесперапынна, — падсумаваў Раман Сташэвіч.

**Сяргей КАРЖЫЦКІ, фота аўтара.**

# НА ВАРЦЕ МІРНАГА НЕБА

## У Беларусь прыбыла партыя найноўшых самалётаў Су-30СМ2

Самалёты атрыманы ў адпаведнасці з планам будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і ваенна-тэхнічнага развіцця з Расійскай Федэрацыяй.



**Камандуючы ВПС і войскамі СПА генерал-маёр Андрэй ЛУК'ЯНОВІЧ** зазначыў: «Паэтапна ідзе планавая мадэрнізацыя, абнаўленне парку ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі. Сёння да нас прыбылі найноўшыя, звышманеўраныя, шматфункцыянальныя знішчальнікі Су-30СМ2».

У гэтай авіяцыйнай тэхніцы вельмі шмат наваўвядзенняў, адзначыў Андрэй Лук'яновіч:

**«У першую чаргу значна выраслі магчымасці па баявым прымяненні як па паветраных, наземных, так і марскіх цэлях. Значна ўдасканалены характарыстыкі дзякуючы інтэграцыі сучасных авіяцыйных сродкаў паражэння і мадэрнізацыі бартавой радыёлакацыйнай станцыі. Палепшана перашкодаабароненасць, сродкі электроннай барацьбы».**

Нашы лётчыкі да палётаў на такіх машынах гатовы: яны прайшлі перанавучанне ў вучэбным цэнтры Расійскай Федэрацыі на гэты тып паветраных суднаў. У найбліжэйшы час будзе прыём авіяцыйнай тэхнікі, тэхнічнае вывучэнне. Ужо літаральна на наступным тыдні дадзеныя самалёты змогуць выконваць асноўную задачу — баявое дзяжурства па супрацьпаветранай абароне. І ў плане баявой падрыхтоўкі лётчыкі змогуць выконваць палёты на гэтым самалёце.

«Сёлета мы яшчэ атрымаем партыю самалётаў Су-30СМ2. На гэтым тыдні да нас паступяць верталёты Мі-35М, — паведаміў Андрэй Лук'яновіч.

**— Гэта пацвярджае, што кіраўнік дзяржавы ўдзяляе пільную ўвагу падтрыманню Узброеных Сіл у баявой гатоўнасці, аснашчэнню сучаснымі ўзорамі ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі».**

**Фота «Ваяр».**




ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
**проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «МПОВТ»**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей** | | | | | |
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 500/С-26562, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 62/19. Площадь: 2977,7 кв. м. Наименование: Здание склада химреактивов (Литер «Б» 1/к). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Обременение: аренда. Капитальное строение с инв. № 500/С-26570, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 62/25. Площадь: 22,9 кв. м. Наименование: Здание неустановленного назначения. Назначение: Здание неустановленного назначения. Составные части и принадлежности: Принадлежности капитального строения: проезды – литеры а, к; площадки – литеры б, д, ж, и; площадки под навес – литеры в, г, е, м, н; пешеходная дорожка, подпорная стена, бордюр, бордюр 0.16, ограждение – литера т, у, ф, ц, ворота, калитка. Обременение: аренда. Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 500000000006008960, площадью 0,7381, предоставленный ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен). На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0100 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадь 0,0468 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **2 755 794,50** | **Задаток, BYN** | **275 579,45** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МПОВТ» Республика Беларусь, 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62. Тел. +375 (17) 388 90 99 E-mail: mpovt@mpovt.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8044 580 63 02 (Александра) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 2 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (не резидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 25 июня 2025 включительно** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **27 июня 2025 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |
| Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона | | | | | |

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «МИНСККОНТРАКТ»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 13.06.2025.**

**Лот № 1:** «ФОЛЬКСВАГЕН ТРАНСПОРТЕР»,
кузов, рама № WV2ZZZ70Z3X017379, 2002 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 16 626,00 руб.
Задаток – 1 662,00 руб.

**Лот № 2:** ГАЗ 3309,
кузов, рама № 33070080151785 X9633090080961477, 2008 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 9 180,00 руб.
Задаток – 918,00 руб.

**Местонахождение Лотов 1–2:**
Минский р-н, пос. Сухорукие, ул. Базовская, 1А.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **11.06.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

**Брестский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ**
**ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Лот № 1:**
1) изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-61326 (наименование: помещение нежилое; назначение: помещение, не относящееся к жилищному фонду) площадью 758,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Пинковичский с/с, д. Пинковичи, ул. Берёзовая, 12-1;
2) изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-61488 (наименование: помещение нежилое; назначение: помещение, не относящееся к жилищному фонду) площадью 92,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Пинковичский с/с, д. Пинковичи, ул. Берёзовая, 12-2;
3) изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-61489 (наименование: помещение нежилое; назначение: помещение, не относящееся к жилищному фонду) площадью 30,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Пинковичский с/с, д. Пинковичи, ул. Берёзовая, 12-3

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **69 685,81** | **Размер задатка, руб.** | **6 968,58** |

**Продавец:** ОАО «Пинскводстрой», 225730, Брестская обл., Пинский р-н, д. Пинковичи, ул. Березовая, 3, тел. 80165673419 (Филиал ПМК-58). **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. Срок заключения договора купли-продажи: в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 12 июня 2025 г. в 11.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **(https://au.nca.by/auction/30996),** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:**
**г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 11 июня 2025 г. до 17.00**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного
открытого аукциона по продаже имущества
**ОАО «Криница»** (Продавец)

**Аукцион состоится 26.06.2025 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

**Лот № 1, состав:**
1. Контрольный пост и проходная, инв. № 621/С-1161, 66,5 кв. м.
2. Здание подсобного блока, инв. № 621/С-1163, 1138,5 кв. м.
3. Помещение мойки пивовозов, инв. № 621/С-1164, 113,6 кв. м.
4. Насосная станция над артскважиной, инв. № 621/С-1166, 50,1 кв. м.
5. Здание насосно-фильтровальной станции, инв. № 621/С-1168, 254,6 кв. м.
6. Сушильный цех, инв. № 621/С-1170, 264,2 кв. м.
7. Административное здание, инв. № 621/С-1171, 322,3 кв. м.
8. Здание главного корпуса, инв. № 621/С-1172, 4055,3 кв. м.
9. Сооружение, площадка для стеклобоя, инв. № 621/С-3617, 111,6 кв. м.
10. Здание котельной, инв. № 621/С-17178, 517 кв. м.
11. Внеплощадочные и площадочные сети водопровода, инв. № 621/С-20589, 2994 м.
12. Кабельная ЛЭП, инв. № 621/С-20588, 1196,7 м.
13. Внеплощадочные и площадочные сети канализации, инв. № 621/С-20587, 2462,2 м.
14. Низковольтные сети промплощадки, инв. № 621/С-20586, 3028 м.
15. Площадочные тепловые сети, инв. № 621/С-20584, 393 м.
16. Сети газопровода, инв. № 621/С-20581, 248 м.
17. Артскважина с насосом ЭВЦ 10х63-110, инв. № 621/С-1028912.
18. Благоустройство (проезды, площадки, ограждения), инв. № 621/С-1029402, площадь – 11366,0 кв. м.
19. Резервуар промывочной воды, инв. № 621/С-1029401, площадь – 27,0 кв. м.
20. Резервуар фильтрованной воды V 500 куб., инв. № 621/С-1029400, площадь – 148,3 кв. м.
21. Резервуар фильтрованной воды V 500 куб., инв. № 621/С-1029399, площадь – 151,5 кв. м.
22. Движимое имущество (перечень на электронной торговой площадке «GOSTORG»(gostorg.by)).
23. Объекты растительного мира (перечень на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by)).

**Адрес** Лота № 1:
Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Кутузова, 7; 7/5; 7/2; 7/1; 7/4; 7/9; 7/8; 7/7; 7/6.
Артскважина: Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, 11.
**Начальная цена** с НДС 20 % – 3 777 759,14 руб.
Задаток – 200 000,00 руб.
Земельные участки:
1. 624250100001000118, 5,2100 га;
2. 624250100001000119, 0,3600 га.
Право постоянного пользования.
**Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков: **24.06.2025 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**
УНП 190055182

# КАНІКУЛЫ З КАРЫСЦЮ

## ПРАЦОЎНЫ ДЗЕНЬ — МЕНШЫ, ЗАРПЛАТА — ТАЯ Ж

Як нагадаў **начальнік упраўлення арганізацыі работы дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва і альтэрнатыўнай службы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Сяргей КАЦКО,** садзейнічанне рэалізацыі правоў моладзі на працу ўвасабляецца ў адпаведнасці з нормамі Закона «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі». Адным з інструментаў з'яўляецца і дзяржаўная праграма «Рынак працы і садзейнічанне занятасці» на 2021—2025 гады. Сам парадак арганізацыі і фінансаванне часовай працоўнай занятасці моладзі, якая вучыцца ва ўстановах адукацыі, рэгулюецца адпаведнай пастановай урада.

### Як знайсці запатрабаванае рабочае месца?

**1.** На партале **gzs.gov.by** знайсці актуальныя вакансіі ў раздзеле «Часовая занятасць».
**2.** Знайсці асобна вынесеныя прапановы для непаўналетніх.
**3.** Выбраць у графе пошуку на сайце сваю вобласць, раён ці абласны цэнтр.

**На гэтым жа сайце можна прайсці тэсты па прафарыентацыі.**

*Таксама для працаўладкавання можна звярнуцца ў службу занятасці па месцы жыхарства ці ва ўстанову адукацыі.*



### Парады тым, хто жадае ўпершыню працаўладкавацца

► Рабіце толькі тую працу, бяспечныя прыёмы выканання якой вам вядомыя.
► У абавязковым парадку выкарыстоўвайце неабходныя сродкі індывідуальнай засцярогі.
► Не трэба выконваць нават па сваёй ініцыятыве тую работу, бяспечныя прыёмы якой вам не вядомыя.
► Варта памятаць, што прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, будоўлі з'яўляюцца аб'ектамі павышанай небяспекі і там не дапускаюцца нядбаласць і свавольства.

*Бязвіннае свавольства можа прывесці да выпадкаў траўміравання або гібелі.*

Работа па садзейнічанні занятасці моладзі Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны вядзецца бесперапынна. Толькі перад летнімі канікуламі ў краіне была створана сістэма, якая дазваляе маладым людзям працаваць круглы год. Але час працы для іх меншы, чым для дарослых. Напрыклад, хлопцы і дзяўчаты ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў могуць працаваць 23 гадзіны ў тыдзень, ад 16 да 18 гадоў — 35 гадзін. Падлеткі 14—16 гадоў адпаведна могуць працаваць у канікулярны перыяд 4 гадзіны 36 хвілін, падчас вучобы ўдвая менш — 2 гадзіны 18 хвілін. Юнакі і дзяўчаты ва ўзросце 16—18 гадоў у дзень працуюць не больш за 7 гадзін падчас канікул і не больш за 3,5 гадзіны — падчас вучобы. Пры гэтым заработная плата ў падлеткаў, нягледзячы на скарочаны перыяд працоўнага часу, не меншая, чым у дарослых, якія працуюць 40 гадзін у тыдзень.

## ДЗЕ МОЖНА ЎЛАДКАВАЦЦА?

Каб павялічыць магчымасці працаўладкавання моладзі, у пачатку гэтага года быў пашыраны пералік відаў работ, якія могуць выконваць маладыя людзі ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў. Раней у ім было 17 пазіцый, цяпер — 23.

Падлеткі могуць працаваць у пунктах пракату (напрыклад, выдаваць веласіпеды, спартыўны інвентар), займацца офіснай работай: наборам тэкстаў, стварэннем прэзентацый, табліц і простых сайтаў. Дапушчальная работа з таварамі: узважванне, пакаванне, кантроль тэрмінаў прыдатнасці; а таксама работа ў кафэ: сервіроўка сталоў, прыём заказаў, збор і мыццё посуду ўручную. Падлеткі такога ўзросту могуць займацца афармленнем святаў і фларыстыкай. Сярод дапушчальных заняткаў — зборка мэблі, рамонт простых механізмаў з дапамогай ручных прылад.

Акрамя таго, можна дапамагаць у швейнай справе (упакоўваць вырабы, ляпіць этыкеткі, рабіць простыя дэкаратыўныя элементы і іншае), дастаўляць ежу і тавары на дом, а таксама працаваць у даведачных і дыспетчарскіх службах (напрыклад, прымаць званкі).

Падлеткі, як і раней, могуць удзельнічаць у сельскагаспадарчых работах (на зборы ягад, грыбоў, выконваць лёгкія заданні на ферме), у азеляненні (садзіць кветкі, даглядаць расліны), працаваць прамоўтарамі (раздача лістовак, удзел у рэкламных акцыях), выконваць дробныя рамонт адзення і абутку і працаваць аніматарамі (напрыклад, у дзіцячых лагерах і парках).

Акрамя таго, быў перагледжаны пералік работ, на якія забараняецца прыцягваць асоб маладзейшых за 18 гадоў. Цяпер у ім працэй арыентавацца і бацькам, і маладым людзям, і наймальнікам. Туды ўключаны прафесіі, па якіх не могуць працаваць непаўналетнія. Гэта дало магчымасць пашырыць варыянты працаўладкавання хлопцаў і дзяўчат больш чым па 160 прафесіях. Напрыклад, у пералік увайшлі работы на асноўным тэхналагічным працэсе, ва ўсе астатнія, дапаможныя, можна прыцягваць непаўналетніх.



Усе прынятыя меры ўжо прынеслі станоўчыя вынікі. За першыя чатыры месяцы 2025-га пры садзейнічанні службы занятасці працаўладкавана звыш 8,5 тысячы маладых людзей — амаль на 2 тысячы больш, чым за адпаведны перыяд летась.

Трэці год перад стартам летняй кампаніі ў красавіку праходзяць агульнарэспубліканскія кірмашы вакансій. Сёлетнія ладзіліся ва ўсіх рэгіёнах на працягу некалькіх дзён, каб як мага больш маладых людзей маглі падабраць сабе работу на лета. У кірмашах вакансій узялі ўдзел больш за 56 тысяч маладых людзей, трэць з іх папярэдне дамовіліся аб летнім працаўладкаванні.

Сёлета будзе дадзены старт новаму праекту Міністэрства працы і сацыяльнай абароны «Час добрых спраў». Летам малады людзі атрымаюць магчымасць працаўладкавацца ў дзяржаўных сацыяльных установах па ўсёй краіне — тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, сацыяльных пансіянатах.

— Гэта не толькі працаўладкаванне, але і выхаваўчая, і прафарыентацыйная місія. Магчыма, хтосьці з маладых людзей у будучыні застанецца працаваць у сістэме сацыяльнай абароны, — адзначыў Сяргей Кацко.

### Якія дакументы патрэбны?

- *накіраванне на работу службы занятасці;*
- *пашпарт ці іншы дакумент, які сведчыць асобу;*
- *даведка, якая пацвярджае навучанне ва ўстанове адукацыі;*
- *медыцынская даведка аб стане здароўя* (форма 1 здр/у-10);
- *пісьмовая згода аднаго з бацькоў* (усынавіцеляў, папячыцеляў) для асоб ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў;
- *працоўная кніжка* (пры яе наяўнасці);
- *заява аб прыёме на работу.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Алена КРАВЕЦ.**

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
28 мая 2025 г. № 19 (800)



# ФЕСТЫВАЛЬ ЗБІРАЕ ЗЕМЛЯКОЎ

Лета на парозе, а значыць настае сезон вясковых свят — падзей, якія збіраюць на малую радзіму людзей з розных куткоў краіны і нават планеты. Вельмі важна, калі чалавеку ёсць куды вяртацца, калі яму там рады, калі яго чакаюць. Органы мясцовага самакіравання клапоцяцца, каб такія сустрэчы былі добра арганізаваны, каб кожны жыхар вёскі, кожны дарагі госць адчуваў сябе ўтульна, ганарыўся месцам свайго паходжання, зноў планаваў прыехаць.



Фота «Слонімскі веснік».

## УВАГА — КОЖНАМУ

Відамлянскі сельсавет Камянецкага раёна складаецца з 25 населеных пунктаў. У некаторых з іх засталося зусім няшмат жыхароў. Каб падтрымаць такія вёскі, у тым ліку ў плане добраўпарадкавання, у свой час быў задуманы фестываль малых вёсак пад назвай «Вёсачка мая — чараўніца». І вось ужо амаль паўтара дзесяцігоддзя кожнае лета фестываль збірае землякоў.

**Старшыня Відамлянскага сельскага Савета Марына КАРАЛЮК** гаворыць, што ў пачатку года вызначаецца населены пункт, дзе будзе праводзіцца свята.

— Падрыхтоўка да фестывалю ідзе працяглы час. Земляні камунікуюць у сацыяльных сетках, дамаўляюцца аб сустрэчы на малой радзіме. На фэст збіраюцца ўсе пакаленні вяскоўцаў. Дзеці, унукі едуць нават здалёк. Нярэдка прыязджаюць і тыя, у каго ўжо не засталося родных. Былі выпадкі, калі земляні з блізкага замежжа набывалі пуцёўкі ў найбліжэйшыя санаторыі з тым разлікам, каб трапіць на дзень роднай вёскі.

**Спонсарамі свята, як правіла, выступаюць сельгаспрадпрыемствы. Падарункі ўручаюць усім калгасным пенсіянерам, ушаноўваюць цяперашніх працаўнікоў, калі такія ёсць. Не абыходзяць увагай маладыя сем'і, шматдзетных бацькоў. Абавязкова ўспамінаюць тых, хто дабіўся вялікіх поспехаў у розных галінах народнай гаспадаркі, кім можа ганарыцца малая радзіма.**

Да гэтага дня гаспадыні дастаюць з куфраў вышыванкі, пасцілкі, іншыя прадметы рукадзелля, афармляюць выставы. Кожнае свята атрымлівае сваю назву. Напрыклад, у праграме фестывалю былі ўжо «Грушаўскі світанак», «Баранкаўскі завітанак», «Млыноўскі беражок», «Куфар Радасці», «Гасцёўня на Лясной», «Мядовы чай на Панскім» і іншыя. Прайшлі яны душэўна, цікава, пакінулі ўдзельнікам яркія ўспаміны. У сельскім Савеце захоўваюцца цэлыя альбомы са здымкамі з мерапрыемстваў, там жа стос падзячных водгукаў — найбольш ад нашчадкаў сталых жыхароў, якія прыехалі на свята, дзе сустрэліся з аднакласнікамі, аднавяскоўцамі, і нібы вярнуліся ў сваё юнацтва.

Фестываль увесь час развіваецца. Цяпер яго абавязковым складнікам становіцца кулінарны фэст «Вясковыя пачастункі», дзе гаспадыні адна перад адной дэманструюць кулінарныя таленты. Мае значэнне не толькі смак традыцыйных вясковых страў, але і іх знешні выгляд, афармленне. У ход ідуць бабуліны рэцэпты, гатуюцца стравы, характэрныя менавіта для гэтай мясцовасці. І дэгустацыя становіцца адным з прыемных момантаў фэсту. Ну і, вядома, асаблівае месца займае культурнае суправаджэнне. Работнікі гэтай сферы прывозяць канцэрты з бадзёрымі песнямі і танцамі.

— Куды б ні завяло чалавека жыццё, малая радзіма застаецца домам назаўжды. Сведчаннем таму падобныя святы вёскі, — разважае Марына Каралюк. — А яшчэ такія сустрэчы яднаюць як саміх вяскоўцаў, так і іх нашчадкаў. Людзі пачынаюць перапісвацца, сябраваць у сацыяльных сетках.

Жыхары чакаюць свята, цікавяцца, калі яно прыйдзе ў іх вёску. Летась фестываль завітаў у Дзямянчыцы, сёлета пачалася падрыхтоўка ў Задвор'і.

## АХОЎВАЮЧЫ ТРАДЫЦЫІ

Выпечка караваяў на Слонімшчыне — старажытная традыцыя, якая сыходзіць каранямі ў глыбокае мінулае і перадаецца з пакалення ў пакаленне. Гэта майстэрства ўнесена ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь. Гэтай традыцыі прысвяцілі фестываль «Паўлаўскія каравай» ў Паўлаўскім сельскім Савеце, які праходзіць штогод з 2017 года. Ён быў рэалізаваны ў рамках мясцовай ініцыятывы «Адраджэнне і папулярызацыя нематэрыяльнай спадчыны Слонімскага раёна» ў праекце «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» па праграме развіцця ААН. Адна з умоў удзелу — правядзенне мерапрыемстваў для папулярызацыі традыцый. Першы фестываль прайшоў сціпла, у мясцовым Доме культуры. Але потым стала зразумела, што імпрэза можа набыць значна большыя маштабы.

— Ладзілі фестываль у розных месцах, а ў мінулым годзе ў яго з'явілася пастаянная пляцоўка, — расказвае **старшыня сельсавета Марыя КАШКО.** — Была незадзейнічаная пустка паміж трасай і адміністрацыйным будынкам. Лакацыя спадабалася, мы аб'ядналіся і вырашылі паўдзельнічаць у конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў, каб пабудаваць сцэну і ўладкаваць месцы для гледачоў. Нашу ідэю падтрымалі, ініцыятыва была рэалізавана. Месца размяшчэння ў фестывалю вельмі ўдалае. Траса М11 — міжнародная, і турысты, праязджаючы міма, змогуць спыніцца і зазірнуць на свята.

Ядро фестывалю — народны фальклорны калектыў «Чараўніцы-каравайніцы», які захоўвае і передае старажытныя рэцэпты маладому пакаленню.

— Я лічу, што ў кожным сельсавеце ёсць свая разынка. І мы сваю знайшлі, — працягвае суразмоўца. — Садзейнічаем таму, каб моладзь пераймала веды нашых бабуль, каб ім на змену прыйшлі новыя майстры і перадалі досвед далей. У нас ёсць творчая гасцёўня, якую празвалі каравайняй, дзе праходзяць майстар-класы. Зусім нядаўна прыязджалі турысты з Мінска, дзеці са Слоніма. А фестываль становіцца акумулюючым пунктам. У нас ёсць і іншыя святы, напрыклад, Свята вёскі, але мы вырашылі, што фестываль будзе самастойным мерапрыемствам.

Марыя Кашко адзначае, што мясцовыя ўлады ў Паўлаўскім сельскім Савеце заўсёды імкнуцца чуць насельніцтва. Вынікам гэтай уважлівасці і стала правядзенне фестывалю. Канешне, рэалізуюцца і іншыя праекты.

— Стараемся згуртаваць жыхароў сельсавета, падключыць іх да грамадскіх спраў. У месенджары стварылі групы па населеных пунктах, каб можна было хутка праінфармаваць людзей, параіцца па якіх-небудзь пытаннях, таму што жыццё — гэта не толькі святы, — заўважае старшыня. — Ёсць і працоўныя моманты. Сельсавет — цэнтр населенага пункта, да нас прыходзяць па парады, дапамогу. Калі мы не можам даць адказ, то выступаем сувязным звяном паміж іншымі структурамі.

Марыя Кашко адзначыла, што гэтыя мясціны — не яе радзіма, але людзі даверыліся ёй і выбралі старшынёй. Чаму яна вельмі рада, бо па сваёй натуры чалавек гаспадарлівы, любіць работу з людзьмі. І гэту неабыякавасць нясе праз усё жыццё. Заўважае, што калі б не цудоўныя людзі, якія жывуць на тэрыторыі сельсавета, не было б ні «Паўлаўскіх караваяў», ні іншых праектаў, а іх рэалізавана нямала. Роля мясцовых улад заключаецца ва ўменні слухаць, аналізаваць і, калі неабходна, дапамагаць.



## СВЯТА АБ'ЯДНОЎВАЕ ПАКАЛЕННІ

У Язоўках, што на Міншчыне, Свята вёскі адзначаецца штогод 12 ліпеня, расказаў **старшыня Лядзенскага сельскага Савета Чэрвеньскага раёна Сяргей ЦЕРАШ.** Традыцыйна мерапрыемства праводзіцца ў Музеі сялянскага быту. Ён быў створаны ў 2011 годзе і размяшчаецца на прыдамавой тэрыторыі адной з вяскоўцаў — 74-гадовай Валянціны Ладуцькі.

Жанчына пэўны час працавала ў Мінску спецыялістам аддзела кадраў у інстытуце «Ваенпраект», дзе і пачала сваю творчую дзейнасць. Праз некаторы час вярнулася на малую радзіму. Пенсіянерка ўжо больш за 20 гадоў піша вершы, вывучае гісторыю роднага краю і людзей, якія тут пражываюць.

«Валянціна — вельмі гасцінны і сардэчны чалавек, таму ў свята вёскі, ды і не толькі, на тэрыторыі яе сядзібы шматлюдна і пануе надзвычай душэўная атмасфера, — тлумачыць старшыня сельсавета. — Каля дома размяшчаецца міні-сцэна, дзе штогод выступаюць запрошаныя творчыя калектывы, рыхтуецца дзіцячая забаўляльная праграма, конкурсы, выставкі».

Для камфортнага размяшчэння ўсіх ахвотных прадугледжаны альтанкі. Акрамя таго, у жыхароў вёскі склалася цудоўная традыцыя — конкурс дамашняй кухні. Мясцовыя кулінары частуюць гасцей рознымі стравамі і напоямі: дранікамі, мачанкай, квасам... Кожны год стравы розныя, але заўсёды ўсё вельмі смачнае.

«На свята запрашаюцца ганаровыя госці, з асаблівым трапятаннем сустракаем таксама нашых пажылых землякоў, — працягвае аповед Сяргей Цераш. — Акрамя таго, гэты дзень важны і для тых ураджэнцаў Язовак, якія пераехалі жыць у сталіцу або іншыя гарады, але не забываюць свой родны кут і прыязджаюць, выказваюць вялікую падзяку арганізатарам гэтага штогадовага мерапрыемства за неабыякавасць і ўвагу да землякоў. Свята аб'ядноўвае людзей розных пакаленняў. Людзі яго сапраўды чакаюць».

Сёлета, па словах старшыні Лядзенскага сельскага Савета, Свята вёскі пройдзе, як звычайна, у Язоўках. А 19 ліпеня яно запланавана ў Вялікаполлі і Дубніках — гэтыя населеныя пункты размешчаны побач адзін да аднаго. «План мерапрыемстваў падрыхтаваны насычаны. Напрыклад, чакаецца выступленне фальклорнага калектыву з Горкаўскага сельскага дома культуры. Упэўнены, землякам гэта мерапрыемства прыйдзецца па душы!» — запэўніў суразмоўца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ, Яна ВАЛАСАЧ.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Минский Агросервис»**

**Аукцион состоится 10.06.2025 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

**Лот № 1:**

**1. Весовая с инв. № 600/С-172167,** 80,6 кв. м, Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, 82/1, станция Колядичи.

**2. Склад-2 минеральных удобрений с инв. № 600/С-172168,** 4140,3 кв. м, Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, 82, станция Колядичи.

**3. Железнодорожный путь необщего пользования № 31 с инв. № 600/С-179214,** 511,1 м, Минская обл., Минский р-н, г. п. Мачулищи, 603, железнодорожный путь;

**4. Железобетонная плита ПАГ 14 (6 м*2 м)** (б/у) в количестве 286 штук, Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, 82, станция Колядичи.

Обременения: аренда помещений весовой с инв. № 600/С-172167 и склада-2 минеральных удобрений с инв. № 600/С-172168.

1. Весовая с инв. № 600/С-172167 и склад-2 минеральных удобрений с инв. № 600/С-172168 расположены на земельном участке 623686600001001253, 5,2656 га.

2. Железнодорожный путь необщего пользования № 31 с инв. 600/С-179214 расположен на:

- земельном участке 623686600001001253, 5,2656 га;
- земельном участке 623686600001000149, 3,4449 га. Часть земельного участка 623686600001000149 будет предоставляться на основании договора об установлении сервитута для проезда и обслуживания железнодорожного пути необщего пользования № 31 с инв. 600/С-179214.

Начальная цена с НДС 20 % – 4 044 086,40 руб.

Задаток – 500 000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – **06.06.2025 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

**ИЗМЕНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ**

**по административно-торговым помещениям в составе объекта «Возведение общежития квартирного типа по ул. Алибегова в г. Минске»,**

***опубликованной в газете «Звязда» от 22.03.2025 № 57 (30445)***

**Застройщик:** коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 05.01.2015 за № 192400611.

**Юридический адрес и местонахождение предприятия:** 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 4-107, тел./факс (017) 234-16-99.

**Офис продаж:** 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 6, офис 213, тел.: (017) 234 16 98, (044) 795 44 44, (044) 559 33 91.

**Режим работы офиса продаж:** понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15, обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

**Цель строительства** – возведение административно-торговых помещений в составе объекта «**Возведение общежития квартирного типа по ул. Алибегова в г. Минске».**

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются:

1. административно-торговое помещение общей площадью **592,29 кв. м (общая площадь торговых залов – 422,82 кв. м);**

2. административно-торговое помещение общей площадью **165,86 кв. м (общая площадь торговых залов – 100,14 кв. м).**

Стоимость 1 кв. м общей площади объекта долевого строительства в текущих ценах с учетом прогнозных индексов – **5 250,00 белорусских рублей с НДС**.

**Условия оплаты –** первоначальный взнос в размере 30 % стоимости объекта долевого строительства в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – ежемесячно в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства.

Документы для заключения договоров создания объектов долевого строительства будут приниматься и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди с 8.30 03 июня 2025 года **по адресу: г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213 (офис продаж).**

**Для подачи заявления и заключения договора необходимо наличие:**

для физических лиц – паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность); доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке;

для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – документа, подтверждающего полномочия представителя, паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность) представителя, копии свидетельства о государственной регистрации и Устава.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и государственное предприятие «Управление капитального строительства Запад» оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации.

УНП 192400611

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

# ЖЫВІ І ДАВАЙ ЖЫЦЬ ІНШЫМ,

## альбо Як праблемы землекарыстання перарастаюць у праблемы ўзаемаадносін

Вядома, добры гаспадар кожны кавалак зямлі імкнецца выкарыстоўваць рацыянальна. І заслугоўвае пахвалы, калі толькі ён не ўшчамляе інтарэсы іншых людзей. Тады ўзнікаюць канфлікты, скаргі, звароты ў самыя розныя інстанцыі. Вось і на гэты раз зварот падчас адзінага дня прыёму грамадзян сенатарамі, які адбыўся на Брэстчыне на пачатку мая, аказаўся «з гісторыяй».

Гэтыя вяскоўцы, пра якіх пойдзе гаворка, мірна суіснавалі да пэўнага часу. Адзін з іх у прыгараднай вёсцы пражывае даўно. Другі купіў суседні дом, развёў вялікую гаспадарку, стаў гадаваць свіней і за сумленна зароблены рубель карміць сям'ю. Усё б нічога, але наш герой сваю ферму трымаў на падворку побач з жылым домам, у тым ліку і суседскім. У матэрыялах крымінальнай справы потым будзе фігураваць 50 галоў свіней... Можна сабе ўявіць, які пах стаіць у наваколлі, дзе кожны дзень спраўляе фізіялагічныя патрэбнасці такая колькасць жывёлы! А яшчэ ў пацярпелага гаспадара было пад сотню курэй ды іншае птаства.

...Пра тое, як пачынаўся канфлікт, невядома. З матэрыялаў крымінальнай справы вынікае, што аднойчы не абцяжараны гаспадаркай сусед, да таго ж нападпітку, узяў петарду, падпаліў яе і кінуў праз суседаў плот. Як ён потым будзе тлумачыць, хацеў папужаць. Надвор'е стаяла сухое, і тая петарда трапіла ў кучку саломы, апошняя ўспыхнула, агонь умомант перакінуўся на гаспадарчыя пабудовы. Пажарных выклікала другая суседка, якая заўважыла дым. Прыехалі хутка. Жыллё і людзі не пацярпелі. Аднак агонь паспеў пашкодзіць тры гаспадарчыя пабудовы: сховішча для агародніны, будынак для кармавых сумесяў, яшчэ адзін хляўчук. І самае галоўнае, загінулі дзясяткі свіней і столькі ж курэй.

Вінаватага затрымалі, можна сказаць, па гарачых слядах. Суд разгледзеў справу і прызначыў грамадзяніну пакаранне ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам на два гады з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, якую ў народзе называюць «хімія». Акрамя таго, яго абавязалі кампенсаваць матэрыяльны і маральны ўрон. Словам, вінаваты панёс заслужанае пакаранне.

Пацярпелы ж адрамантаваў хлявы, аднавіў пагалоўе і зноў гадуе свіней пасярод вёскі. Яго сусед змяніў тактыку — пачаў пісаць скаргі ва ўсе інстанцыі на парушэнне санітарных і ветэрынарных нормаў. Да гаспадара-свінавода зачасцілі праверкі. Дык вось гаспадар і прыйшоў на прыём з просьбай абараніць ад розных камісій, якія перашкаджаюць працаваць.

Сітуацыя, згадзіцеся, неадназначная. Паводле цяперашніх норм, гаспадар мае рацыю, бо адменены ўсе ранейшыя патрабаванні па адлегласці паміж гаспадарчымі і жылымі пабудовамі. Выходзіць, на сваім участку — што хачу, тое і раблю. А як жыць суседзям? Асабліва ў спёку, калі хочацца адчыніць акно і ўпусціць у дом свежае паветра. Думаю, пытанне рытарычнае. І пры ўсёй павазе да людзей працы падобныя пытанні павінны быць урэгуляваны адпаведнымі дакументамі, нарматыўнымі актамі.

Пра гэта гаварыў яшчэ падчас прыёму **першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый ГАРАДЗЕЦКІ,** які выязджаў на месца. На выніковым пасяджэнні ў Мікашэвічах тэму працягнуў **кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый УЛАСІК.** Дзмітрый Леанідавіч унёс прапанову вярнуцца да ранейшых нарматыўных дакументаў, якія рэгулявалі адлегласць ад агароджы суседа да гаспадарчых пабудоў. Раней, дарэчы, такія абмежаванні датычыліся нават пасадкі пладовых дрэў. Трэба было адступіць мінімум паўтара метра ад мяжы. А цяпер, выходзіць, нават кароўнік альбо свінарнік можна ўзводзіць на ўчастку ў 15 сотак.

А заадно варта было б перагледзець правілы выдачы дазволу на вядзенне асабістай падсобнай гаспадаркі. Логіка падказвае, што такі дазвол магчымы пры наяўнасці кавалка зямлі ў полі, а не пры доме. Інакш пачынае дзейнічаць правіла: дазволена ўсё, што не забаронена законам. Некаторыя ж грамадзяне, як паказвае практыка, падобную свабоду не суадносяць з цвярозым сэнсам. Як у выпадку з сабакамі на падворку аднаго грамадзяніна. Гэта прыклад таксама з даклада Дзмітрыя Уласіка. Чалавек прысвяціў увесь свой час або яго частку пачэснай справе — стаў даваць прытулак бадзяжным сабакам, карміць іх, лячыць. А калі на падворку сабралася іх больш за сотню, суседзі пайшлі па інстанцыях са скаргамі. Скардзіліся на агрэсіўныя паводзіны жывёлін, начны шум, антысанітарыю. Можна сабе ўявіць такое суседства.

Падтрымліваю кіраўніка спраў аблвыканкама, што варта ўзмацніць не толькі кантроль за выкананнем норм утрымання, але і меры ўздзеяння. І правіла «Мой дом, чытай, падворак — мая крэпасць, а на сваім кавалку зямлі раблю, што хачу» — тут не працуе. Калі гэта «крэпасць» перашкаджае нармальна жыць навакольным, то яны павінны мець гарантыю абароны.

Здавалася б, усё проста: хочаш гадаваць або ўтрымліваць жывёлу, бяры кавалак зямлі, будуй памяшканне за межамі населенага пункта, каб нікому не перашкаджаць. А на прысядзібным участку варта дазволіць трымаць адну-дзве, няхай тры свінкі, як бывала раней у вёсках. Так жа і з буйной рагатай жывёлай, з сабакамі. Павінна быць абмежаванне ў колькасці галоў, ды і птаства не выпадае сотнямі разводзіць на падворку. Ніхто ж не хоча дзень пры дні душыцца чужым смуродам. А што рабіць, калі цябе вымушаюць? Застаецца шукаць абароны ў законах, а калі яны недасканалыя, варта іх удасканальваць. Каб, як той казаў, людзі жылі і давалі жыць іншым.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



# ПАРАДАК — АГУЛЬНАЯ СПРАВА

## Галоўнай тэмай 15-й сесіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў дваццаць дзявятага склікання стаў Год добраўпарадкавання

ГОД ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ

**У Гродзенскай вобласці ўсе актыўна ўключыліся ў рэалізацыю плана мерапрыемстваў у рамках Года добраўпарадкавання, каб выканаць даручэнне кіраўніка дзяржавы і навесці парадак на ўсёй тэрыторыі Прынёманскага краю.**

— З пачатку года зроблена нямала. Асаблівая ўвага накіравана на добраўпарадкаванне прыдамавых тэрыторый і тэрыторый агульнага карыстання, — адзначыла **старшыня абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА**, а таксама акцэнтавала, што галоўная задача для дэпутатаў — прыцягненне насельніцтва. Важна, каб кожны жыхар разумеў, што парадак і чысціня на ўласным участку і прылеглых тэрыторыях — зона яго асабістай адказнасці.

— Добра сябе зарэкамендавалі такія традыцыйныя формы, як правядзенне суботнікаў — рэспубліканскіх і мясцовых. Напрыклад, у Карэліцкім раёне з пачатку года было праведзена 250 суботнікаў, у Мастоўскім раёне — 120. Гэта сведчыць аб тым, што людзі гатовы разам наводзіць парадак. Яшчэ адно важнае пытанне — далучэнне насельніцтва да рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў. Сёлета ў абласны Савет паступіла 54 заяўкі для ўдзелу ў конкурсе, было вызначана 13 пераможцаў.

Акрамя таго, на сесіі абмяркоўвалася прыцягненне моладзі да работы па навядзенні парадку на зямлі, у тым ліку арганізацыя валанцёрскай дзейнасці. Асабліва актуальна гэта для сельскай мясцовасці, дзе пражываюць пажылыя адзінокія людзі, якім патрэбна дапамога па гаспадарцы.

Аб удзеле насельніцтва гаварыў і старшыня Слонімскага раённага Савета дэпутатаў Алег Таргонскі. Ён адзначыў, што ў раёне праведзена вялікая работа з пустымі дамамі. Многім аб'ектам удаецца знайсці новых уладальнікаў, якія іх добраўпарадкоўваюць, аварыйныя памяшканні ідуць пад знос. У 2024 годзе Слонімскі раён увайшоў у тройку лідараў у краіне па продажы пустых дамоў. З пачатку 2025-га 70 безгаспадарчых аб'ектаў узяты ў абарот, 29 з іх прададзены, астатнія будуць знесены.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**

# ПАТРЫЯТЫЧНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА ДЭПУТАТА

## Народны злёт «Маёўка-фэст» упершыню адбыўся ў Сянне

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

**Гэта мерапрыемства ініцыяваў член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь па экалогіі і прыродакарыстанні, старшыня Віцебскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання «Патрыёты Беларусі» Уладзімір БАБІЧАЎ.**



**Уладзімір БАБІЧАЎ *(злева)* падзякаваў за падтрымку ініцыятывы старшыні Сенненскага райвыканкама Алегу МАКАРЭВІЧУ.**

Дэпутаты самі выбіраюць формы арганізацыі сваёй работы на месцах. Уладзімір Бабічаў часта выкарыстоўвае магчымасць сабраць вялікую колькасць людзей, каб наладзіць стасункі з імі ў простай абстаноўцы: «Калі мы разам, нас многа — гэта натхняе. Маё месца — сярод людзей».

Напрыклад, у Талачыне парламентарый рэалізоўвае інфармацыйны праект «РИНГ: реальность, история, народ, государство», у рамках якога штомесяц праходзяць вялікія дыялогавыя пляцоўкі з удзелам спецыялістаў-экспертаў. Усе аграгарадкі Дубровеншчыны, 20 гадоў таму пераўтвораныя па прэзідэнцкай праграме развіцця сяла, ахапіла культурна-асветніцкая акцыя «У будучыню Беларусі». Дубровенскі і Лёзненскі раёны сустракалі агульнарэспубліканскую акцыю, арганізаваную сумесна з Міністэрствам культуры, — «Разам з мастацтвам». Усё дзеля таго, каб і ў глыбінцы людзі адчувалі сябе далучанымі да працэсаў, якія адбываюцца ў краіне.




**Жыхары Сянна ганарацца ўручэннем іх гораду вымпела «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны».**

«Маёўка-фэст» супаў з рэспубліканскай акцыяй Міністэрства абароны «Марш Перамогі», якая стартавала менавіта ў Сянне.

Патрыятычны аўтапрабег «Аўтамай» дазволіў сотні яго ўдзельнікаў палюбавацца прыгожымі краявідамі Сенненшчыны. Ускладаннем кветак да Вечнага агню на брацкіх могілках мясцовыя жыхары і госці ўшанавалі памяць загінулых герояў. Затым яны з цікавасцю паслухалі ўдзельнікаў кафедры «Праўда аб Вялікай Айчыннай вайне — наш шчыт» — дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Ірыну Астапенка і Сяргея Клішэвіча. Тут жа адбылася прэзентацыя кнігі «Невядомыя старонкі вайны адкрываюць дэпутаты беларускага парламента». Дарэчы, Уладзімір Бабічаў — суаўтар артыкула пра ўраджэнца Дуброўна лётчыка-авіяразведчыка Івана Багданава.

Моцнае ўражанне пакінула ў сэрцах удзельнікаў народнага злёту наведванне музейнай экспазіцыі «Люстэрка памяці» аб генацыдзе беларускага народа ў гады вайны. І зусім іншыя, станоўчыя эмоцыі выклікала экскурсія па найбагацейшым мясцовым Доме рамёстваў.

— Хочацца, каб пра нашых таленавітых землякоў, нашы ўнікальныя мясціны, патэнцыял рэгіёнаў даведвалася як мага больш людзей, — ставіць задачу народны выбраннік. — Магчыма, гэта стане штуршком да распрацоўкі і рэалізацыі інвестыцыйных праектаў у глыбінцы, што з'яўляецца адным з пунктаў маёй перадвыбарнай праграмы. Нездарма ў каманду ўдзельнікаў народнага злёту я запрасіў кіраўнікоў прадпрыемстваў і прадстаўнікоў бізнесу.

У арсенале дэпутата таксама традыцыйныя сустрэчы з выбаршчыкамі. Толькі летась іх адбылося 19, а яшчэ — 14 прамых ліній, 145 сустрэч з працоўнымі калектывамі. Разгледжана звыш сотні зваротаў грамадзян, усе пытанні ў рамках закона вырашаны станоўча.

— Важна апраўдваць давер людзей, — адзначае Уладзімір Бабічаў. — Не так даўно мяне спынілі проста на вуліцы і паведамілі: «Прыйдзем да вас на прыём. Нам сказалі, што вы ўсім дапамагаеце». Шчыра кажучы, дапамогу ў жыццёвых пытаннях (будзе гэта рамонт дарог ці жылля, гандлёвае абслугоўванне ці чысціня вады) аказваюць пераважна мясцовыя органы ўлады і профільныя арганізацыі. Таму я імкнуся пабудаваць партнёрскія адносіны з імі.

У такім кірунку — на карысць сваіх выбаршчыкаў — Уладзімір Бабічаў нацэлены працаваць і далей. Планаў у энергічнага маладога дэпутата багата.

**Святлана ЯКАЎЛЕВА,**
**фота аўтара.**

# О реализации имущества СООО «МЯСОПРОДУКТ»

Торги по реализации имущества ООО «МЯСОПРОДУКТ» (1 лот), проведенные **27.05.2025 в 12.00** признаны несостоявшимися по причине отсутствия заявок

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | ООО «АсистБанкрот», УНП 693326101, тел. +37544 7945248 |
| **Продавец** | СООО «МЯСОПРОДУКТ», УНП 800016744, тел. +375333070212 |
| **Форма, дата, время и место проведения торгов** | Повторные торги в форме открытого аукциона **10.06.2025 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6/1-9, оф. 301 |

**Сведения о предмете проведения торгов**

**Лот № 1 (все одним лотом):**

- капитальное строение (наименование – Здание мясоколбасного цеха) с инвентарным номером 622/С-20986, состоящее из недвижимых улучшений (здание мясоколбасного цеха А1/п с пристройками 1 – 12, 22, 23, 25, 26, 28–30, холодильными камерами 13–18, навесами 19, 24, 27, складом № 1 20, складом № 2 21, крыльцами б и в, дымовой трубой а) общей площадью здания 1596, 1 $м^2$, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625481704116000002, по адресу: Минская область, Столбцовский район, Старосверженский с/с, 6, район д. Скоморошки;
- капитальное строение (наименование – Здание группы оформления документов) с инвентарным номером 622/С-40413, состоящее из недвижимых улучшений (Здание группы оформления документов В1/м с пристройкой 1 и крыльцом) общей площадью здания 36,8 $м^2$, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625481704116000002, по адресу: Минская область, Столбцовский район, Старосверженский с/с, д. Скоморошки, ул. Восточная, 15/2;
- капитальное строение (наименование – Здание КПП) с инвентарным номером 622/С-40412, состоящее из недвижимых улучшений (Здание КПП В1/д с пристройкой 1 и дымовой трубой) общей площадью здания 29,6 $м^2$, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625481704116000002, по адресу: Минская область, Столбцовский район, Старосверженский с/с, д. Скоморошки, ул. Восточная, 15/1;
- дороги асфальтобетонные;
- навес-ограждение дезбарьера;
- забор-ограждение по периметру территории предприятия;
- производственное оборудование и инвентарь согласно списку, размещенному на сайте: https://likvid.by.

**Сведения о земельном участке:**

**- земельный участок с кадастровым номером 625481704116000002, площадь – 0,9851 га, назначение – обслуживание выкупленных зданий и сооружений, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования.**

По вопросу ознакомления с предметом торгов, дополнительной информации обращаться по тел. моб.: +375333070212, +375447945248

**Начальная цена предмета торгов:**
Лот № 1 – **806 376,66** (восемьсот шесть тысяч триста семьдесят шесть долларов США 66 центов) с НДС по ставке 20 %.
Валюта платежа: белорусский рубль с применением курса Национального банка Республики Беларусь на дату платежа.
**Место нахождения предмета торгов:** Минская область, Столбцовский район, Старосверженский с/с, д. Скоморошки, ул. Восточная, 15/1, 15/2

**Порядок проведения торгов**

Шаг аукциона – 5 %. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявки на участие в них только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Размер задатка, сроки приема заявлений и порядок зачисления задатка**

Задаток в сумме 10 % от стоимости предмета торгов перечисляется в срок по **09.06.2025** на р/с BY86UNBS30122537200000000933 в ЗАО «БСБ Банк», г. Минск, код UNBS BY2X, получатель – ООО «АсистБанкрот», УНП 693326101, назначение платежа – задаток за участие в аукционе. Валюта платежа: белорусский рубль с применением курса Национального банка Республики Беларусь на дату платежа.
Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в торгах. Прием заявлений с приложением документов осуществляется с 9.00 28.05.2025 по 18.00 09.06.2025 заказной корреспонденцией по адресу: ООО «АсистБанкрот» (220079, г. Минск, а/я 256) либо по e-mail: asistbankrot@gmail.com.

**Совместно с заявлением на участие в торгах предоставляется:**
**Юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь** – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники, доверенность представителя юридического лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица.
**Юридическим лицом, иной организацией – нерезидентом Республики Беларусь** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
**Индивидуальным предпринимателем** – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона.
**Индивидуальным предпринимателем – нерезидентом Республики Беларусь** – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
**Представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь** – нотариально удостоверенная доверенность.
**Представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя** – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов

**Срок подписания договора и срок оплаты приобретенного предмета торгов:**
Срок подписания договора – 10 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.
Срок оплаты приобретенного предмета торгов – 3 банковских дня от даты заключения договора

| | |
|---|---|
| **Возмещение затрат** | Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, а также оплатить вознаграждение Организатору торгов в размере 1,5 % от окончательной цены продажи предмета торгов, в течение 3 банковских дней со дня проведения торгов |
| **Документы, необходимые для участия в торгах** | Заявка на участие в торгах, платежный документ о перечислении задатка; документ, подтверждающий полномочия на участие в торгах |

Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 26.04.2025

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует
о проведении открытого аукциона
по продаже имущества, принадлежащего
открытому акционерному обществу
«Слонимская
камвольно-прядильная фабрика»

**Аукцион состоится 30.06.2025 г. в 11.00
по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.
Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 450/С-20867 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – пилорама), площадью 344,9 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Брестская, 50/7;<br>- система пожарной сигнализации, г. в. 24.10.2012;<br>- трансформатор ТМТ-400/10, г. в. 01.06.1998.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 425450100001010263, площадью 0,4959 га (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания пилорамы), расположенном по адресу: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Брестская, 50, корпус 7 |
| **Условия проведения аукциона** | Вовлечение в хозяйственный оборот в течение двух лет с момента заключения договора купли-продажи |
| **Начальная цена продажи** | 98 605,07 р. (девяносто восемь тысяч шестьсот пять рублей семь копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 9 860 р. (девять тысяч восемьсот шестьдесят рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:<br>г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208,<br>с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг)<br>и с 8.30 до 16.30 (пятница).<br>Обед с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 26.06.2025 г. до 15.00** |

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества

**Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие
«Витебский областной центр маркетинга»**
извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Г.002.00115**
по продаже имущества на электронной торговой площадке
ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** РУП «Витебский ЦСМС», 210015, Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 20, тел. 8 0212 48-04-19.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 26.06.2025 в 9.00
(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

**Лот № 1.** Грузовой специальный автокран MAZ 5334 KS 3577-3-2, год выпуска не определен, регистрационный знак АК 8418-2, кузов (рама) 133188, цвет – синий, инвентарный № 238.
2) возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись;

3) заключить договор аренды по результатам аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

В случае отказа или уклонения Участника аукциона, ставшего победителем аукциона (единственным участником аукциона), от выполнения следующих обязанностей:

– подписания протокола о результатах аукциона;
– оплаты суммы, по которой продано право заключения договора аренды;
– возмещения затрат на организацию и проведение аукциона;
– заключения договора аренды – **уплачивается штраф** в размере 50 базовых величин.

Если при проведении аукциона участник аукциона вместе с другим(и) участником(ами) аукциона согласится с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласится со следующей объявленной аукционистом ценой и после предложения аукциониста этим участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона, ни один из этих участников не предложит свою цену, в результате чего аукцион будет признан нерезультативным, участник аукциона **уплачивает штраф** в размере 50 базовых величин.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

**Телефон для справок (8-0162) 22-10-20, тел./факс 22-15-42.**

# «У НАС АДНА МЭТА — ПЕРШАЕ МЕСЦА»

## Старшыня Беларускай федэрацыі пляжнага футбола Міхаіл БОТНІКАЎ аб тым, як зрабіць немагчымае магчымым



Галоўны трэнер зборнай Нікалас Альварада і Міхаіл Ботнікаў (справа)

Сярэбраныя медалі нацыянальнай зборнай па пляжным футболе на нядаўнім чэмпіянаце свету без перабольшання сталі фурорам. Хаця б таму, што ніводнай нашай зборнай падобнае не ўдавалася. А яшчэ таму, што пляжны футбол у Беларусі развіваецца ўсяго 16 гадоў. Увайсці ў гісторыю за вельмі кароткі па мерках гісторыі тэрмін — унікальны вынік. Бо ў пляжнага футбола няма выключных умоў. Вядучыя гульцы зборнай доўгі час сумяшчалі спорт з работай у розных арганізацыях і структурах: таксі, МНС, Узброеных Сілах, фірме па рамонце дамафонаў... Але ўпартасць і самааддача, вера ў сябе і спартыўны максімалізм прывялі беларусаў у лік сусветных лідараў. Старшыня Беларускай федэрацыі пляжнага футбола Міхаіл Ботнікаў расказаў, з якімі складанасцямі даводзіцца сутыкацца і як каманда зрабіла немагчымае магчымым.

***— Фінальны матч з Бразіліяй быў, без перабольшання, легендарным. Улічваючы, што бразільцы — рэкардсмены па колькасці перамог на чэмпіянатах свету, такому сапернiку не сорамна і прайграць, тым больш з лікам 3:4...***

— Крыўдна... Мы павінны былі выйграць. Мы ехалі па першае месца. Пасля бразільцы самі адзначалі, што нашы хлопцы гулялі на роўных. Але крыху не пашанцавала. У спорце ж шанцуе наймацнейшым, а зборная Бразіліі — гэта чараўнікі мяча, як многія жартуюць, маўляў, яны нарадзіліся адразу з мячом і ўжо на пляжы. Але і наша каманда не была хлопчыкамі для біцця, гулялі на роўных, а значыць, павінны былі перамагаць. Мы, праўда, моцна засмуціліся ад паражэння, са стадыёна ехалі моўчкі. Нягледзячы на вялікае дасягненне, усе засмучаныя. Эфекту «вау» няма ні ў кага. Мы рады, так. Круты вынік. Мы — другія ў свеце. Але... У нас усюды адна мэта — першае месца. На кожны турнір ставім перад сабой максімальныя задачы, і адпаведна вышэйшы вынік, таму што абсалютна кожны выкладваецца крыху больш, чым на 100 працэнтаў.

***— Міхаіл Юр'евіч, калі аб'ектыўна: умоў для развіцця пляжнага футбола значна менш, чым у іншых гульнявых відаў спорту, а вынік значна лепшы. Як такое магчыма?***

— Поспех у спорце складаецца з розных кампанентаў. Галоўнае, што хлопцы займаюцца пляжным футболам у першую чаргу па любві. Гэта не прыгожыя словы, а факт. Спорт не прыносіць ім вялікага заробку, але яны яго настолькі любяць, што прысвячаюць яму ўвесь свой час. Вялікі дзякуй іх сем'ям, якія гэта прымаюць, падтрымліваюць і таксама жывуць пляжным футболам. У нас выдатны трэнер, на сто працэнтаў адданы камандзе. І хлопцы адказваюць яму ўзаемнасцю, вельмі яго любяць і паважаюць. Ніка (галоўны трэнер зборнай Беларусі па пляжным футболе Нікалас Альварада — **Заўв. рэд.)** быў цудоўным футбалістам. А як трэнер ён рос ужо разам з нашай камандай, дзякуючы чаму ў іх склалася поўнае паразуменне. Рэдка класны гулец становіцца добрым трэнерам, але Ніка — менавіта той выпадак. Ён думае і як гулец, і як трэнер, што, безумоўна, ідзе на карысць камандзе. І яшчэ адзін вельмі важны складнік. Нашы хлопцы выходзяць з горда паднятай галавой, ад душы співаюць гімн і зараджаюць сябе на добрае выступленне. Разумеюць, што выступаюць за краіну. А Радзіма — гэта бацькі, жонкі, дзеці, мы за іх выступаем.

***— Касцяк нацыянальнай зборнай складаюць хлопцы з райцэнтраў. Наогул, як пляжны футбол развіваецца ў рэгіёнах?***

— Сапраўды, практыка паказвае, што людзі, якія выраслі ў вёсках, маленькіх гарадах, часта дамагаюцца поспехаў у жыцці. Маючы на старце не самыя лепшыя ўмовы, яны больш настроены заняць сваё «месца пад сонцам» і ўсё для гэтага робяць. Пакуль з рэгіёнаў пляжны футбол развівае толькі Магілёўскі цэнтр алімпійскага рэзерву. І за гэта вялікі дзякуй былому дырэктару ўстановы Дзмітрыю Чыгіру, якому падабаецца пляжны футбол. Дзякуючы яго настойлівасці ў цэнтры з'явіліся групы па пляжным футболе. Сёння Магілёўская каманда ЦАР — галоўная апора для нацыянальнай зборнай. На мінулым тыдні, дарэчы, яны заваявалі Суперкубак Беларусі. У іншых рэгіёнах такіх энтузіястаў, на жаль, пакуль няма. Разам з калегамі з Мінспорту, РНПЦ спорту мы распрацавалі методыку падрыхтоўкі гульцоў менавіта па пляжным футболе. Сёлета яна будзе канчаткова ўзгоднена і зацверджана. Маючы нарматыўна-прававую базу, мы зможам больш настойліва і афіцыйна прасіць дзіцяча-юнацкія школы і іншыя ўстановы ствараць групы па пляжным футболе.

А наогул у мяне як у кіраўніка федэрацыі ёсць мара, каб у футбольных клубах былі групы па пляжным футболе, па футзале. Хтосьці адразу прыйдзе ў гэтыя віды спорту, хтосьці пяройдзе з футбола. Ва ўсіх па-рознаму. Самае галоўнае, каб у дзяцей была магчымасць убачыць пляжны футбол, зразумець, што гэта такое. Тады ў нас і будзе рэзерв, перспектыва. Пакуль клубы не хочуць ісці на гэта. Але мы працуем, шукаем шляхі вырашэння. Усё залежыць ад чалавечага фактару. Калі з'явіцца энтузіяст, гатовы ўзяцца за развіццё пляжнага футбола ў сваім горадзе, — мы яму ўсяляк дапаможам.

***— Але як гэта рабіць без інфраструктуры...***

— Яна паступова з'яўляецца. Я вельмі ўдзячны Міністэрству спорту, Нацыянальнаму алімпійскаму камітэту за тое, што падтрымалі ініцыятыву федэрацый, у якіх ёсць пляжныя віды (гандбол, валейбол, тэніс і футбол) па будаўніцтве крытага манежа. Сёлета на тэрыторыі спартыўна-аздараўленчага комплексу «Алімпійскі» адкрыецца манеж пляжных відаў спорту. Гэта дасць магчымасць нашай зборнай рыхтавацца дома круглы год. Ахвотных стварыць групы для дзяцей па пляжным футболе ў Мінску ўжо ёсць, таму з адкрыццём манежа можна будзе гаварыць і аб запуску школ.

***— Нягледзячы на праблемы, вынік красамоўны. Як калегі з міжнароднай федэрацыі ацэньваюць вопыт развіцця пляжнага футбола ў нашай краіне?***

— Цяпер ужо ўсе прывыклі да нашых поспехаў. Але раней калегі былі шчыра здзіўлены вынікамі краіны, у якой няма мора і не самы спрыяльны для пляжнага футбола клімат. Калегі з міжнароднай федэрацыі засталіся пад вялікім уражаннем ад II Еўрапейскіх гульняў. Яны былі ў захапленні ад нашага стадыёна, ад арганізацыі спаборніцтваў. І я ведаю, што яны чакаюць магчымасці зноў правесці ў нас гульні.

***— І пры гэтым у пляжнага футбола ёсць надзвычайны вынік, ёсць моцная нацыянальная зборная, ёсць народная цікавасць. Міхаіл Юр'евіч, чаго не хапае для поўнага шчасця?***

— Не хапае людзей, якія любілі б пляжны футбол і хацелі б яго развіваць. Можна ісці ад колькасці да якасці, але мы ідзём ад якасці да колькасці. Якасць ёсць, а колькасці не хапае. Не хапае каманд у абласных цэнтрах, а ў кожнай вобласці ёсць футбольныя клубы, якія маглі б падставіць плячо... Не хапае інфраструктуры ў рэгіёнах, аднаго манежа ў абласным цэнтры будзе дастаткова. Гэта ж і сацыяльны праект. Мы ж забіраем дзяцей з вуліцы. Калі дзякуючы пляжнаму футболу са ста дзяцей хоць бы пяцёра будуць здаровымі, фізічна развітымі — гэта ўжо поспех. А чым больш у дзяцей магчымасцяў займацца рознымі відамі спорту — тым здаравей насельніцтва.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота Беларускай федэрацыі пляжнага футбола.**


## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *06 июня 2025 г.* проводит открытый *аукцион* по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право заключения договора аренды. **Арендодатель имущества и организатор аукциона:** государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, тел. +375 (17) 516 80 64).

**Порядок проведения аукциона** определен Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение).

| № лота | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер арендной платы в БАВ* | Коэфф. спроса | Начальная цена права заключения договора аренды имущества / сумма задатка (руб.) | Целевое использование имущества | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1 | г. Минск, ул. Промышленная, 9/2 (в здании специализированном складов с инв. № 500/С-5953 общ. пл. 202,8 кв. м) | 45,7 | 27,19/ **510,36 бел. руб.** | 1,7 | 214,45 | Склад и иные цели, возможные на данных площадях | Склад 14. Отдельный вход. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 2 | г. Минск, ул. Промышленная, 9, здание проходной с инв. № 500/С-5951 общ. пл. 41,2 кв. м | 41,2 | 24,51/ **460,05 бел. руб.** | 1,7 | 193,33 | Любые цели, возможные на данных площадях | Здание проходной полностью. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 3 | г. Минск, ул. Промышленная, 9/4, здание нежилое с инв. № 500/С-56343 общ. пл. 24,2 кв. м | 24,2 | 16,09/ **302,01 бел. руб.** | 1,9 | 113,56 | Любые цели, возможные на данных площадях | Капитальное строение полностью. Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 4 | г. Минск, ул. Казинца, 96А (151,1 кв. м в здании склада с инв. № 500/С-27043, общ. пл. 196,5 кв. м, 101,4 кв.м в здании склада с инв. № 500/С-27041, общ. пл. 135,9 кв. м, 68 кв. м административное здание с инв. № 500/С-17488 полностью) | 320,5 | 280,44 / **5 263,86 бел. руб.** | 2,5 | 1 503,95 | Любые цели, возможные на данных площадях | 4 помещения (41,2 кв. м, 49,3 кв. м, 32,2 кв. м и 28,4 кв. м) с отдельными входами в здании склада 500/С-27043 3 помещения (83,2 кв. м, 11,7 кв. м и 6,5 кв.м) с отдельным входом в здании склада 500/С-27041. Административное здание полностью. Имеется электроснабжение. Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 5 | г. Минск, ул. Масюковщина, 30. Автомобильная стоянка с инв. № 500/С-67662 общ. пл. 10 879,2 кв. м | 10 879,2 | **18 986,25 бел. руб.** | - | 4 746,56 | Открытая площадка для хранения | Составные части и принадлежности: площадка под автостоянку, тротуар, ограждение, туалет, здание КПП |

**Без учета коэффициента для отдельных видов деятельности (устанавливается при наличии оснований).*

**Базовая арендная величина составляет 18,77 бел. руб., размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.*

В отношении лотов №№ 1–5 торги являются повторными.

Техническое улучшение помещений, а также текущий ремонт осуществляются за счет Арендатора и последующей компенсации не подлежат.

Договоры аренды заключаются сроком на 3 (три) года, в отношении лота № 5 – на 1 (один) год.

Аукцион является повторным. Предыдущая информация о торгах опубликована в газете «Звязда» от 22.04.2025.

**Аукцион состоится 06 июня 2025 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 (актовый зал).**

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, по 05 июня 2025 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 17.00.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – **www.rlt.by;** Минского областного исполнительного комитета – **www.minsk-region.gov.by;** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/ АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»)

# ДЭБАТЫ З ПАХАМ СКАНДАЛУ

## Эксперты — пра палітычныя баталіі на выбарах прэзідэнта ў Польшчы

**У пятніцу ў польскай сталіцы адбыўся сапраўдны батл за званне «лідара нацыі». Два прэтэндэнты на прэзідэнцкую пасаду сарвалі горла, спрабуючы даказаць, хто ж здолеў прыцягнуць больш прыхільнікаў, паведамляе тэлеканал СТБ.**

Нагадаем, у другі тур галасавання, які адбудзецца ўжо праз тыдзень, выйшлі апазіцыйны кандыдат Караль Наўроцкі і мэр Варшавы Рафал Тшаскоўскі. Разам яны не набралі нават 70 % галасоў выбаршчыкаў — рэкордна нізкі паказчык для Польшчы, як, дарэчы, і яўка на гэтыя выбары.

І тым не менш лічбы на акцыях падтрымкі кандыдатаў аказаліся вельмі ўражальнымі. Мітынг Рафала Тшаскоўскага сабраў 140 тысяч чалавек, у той час як яго сапернік, Караль Наўроцкі, змог мабілізаваць толькі каля 50 тысяч. Аднак не ўся масавасць прыхільнікаў Тшаскоўскага была шчырай.

Польскія СМІ раскрылі, што шматтысячны натоўп складаўся з праплачаных бюджэтнікаў. Дарэчы, прыйшоў падтрымаць свайго праеўрапейскага калегу і нваспечаны прэзідэнт Румыніі. Як бы там ні было, польскі народ, які цяпер стаіць перад вельмі цяжкім выбарам, ужо не імкнецца падымаць сцяг ЕС у неба.

— Польшча не зменіцца, калі Тшаскоўскі стане прэзідэнтам. Яна проста не зможа вызваліцца ад замежнага ўплыву, ад уплыву нашых нямецкіх і французскіх суседзяў. Не ўжо прадаюць, а што будзе, калі сюды звязуць усіх мігрантаў і зброю. Тады і адгукнецца еўрапейская дэмакратыя, якая ўжо зрабіла Румынію рабом палітычных гульняў, — агучыла меркаванне адна з удзельніц мітынгу.

Аднак гучней за ўсіх працягвае крычаць прэм'ер-міністр Дональд Туск. Так, напярэдадні ён заявіў, што ў выпадку перамогі апазіцыйнага кандыдата Караля Наўроцкага на прэзідэнцкіх выбарах краіну можа чакаць грамадзянская вайна. Занепакоенасць палітыка напрамую звязана з вынікамі нядаўняга апытання, згодна з якім рэйтынгі грамадзянскай падтрымкі Тшаскоўскага і Наўроцкага зраўняліся.

— Неабходна наладзіць сувязь паміж прэзідэнтам і урадам, якой цяпер няма і не будзе, калі Наўроцкі выйграе. Мы змаглі перамагчы ў кастрычніку 2023 года, калі фарміравалася наша кіруючая кааліцыя. Аднак цяпер стаўкі вельмі высокія. Я патрабую мабілізацыі электарату на карысць Рафала Тшаскоўскага. У адваротным выпадку вайны не пазбегнуць, — заявіў на мітынгу прэм'ер-міністр Польшчы Дональд Туск.

І вось у чым інтрыга: другі тур электаральнай гонкі ўсё бліжэй, а фаварыт Бруселя Тшаскоўскі яшчэ ніяк не можа выбіцца ў лідары. Аднак інцыдэнт на тэледэбатах, якія прайшлі ў пятніцу, верагодна, згуляў яму на руку. Там, на вачах у мільёнаў палякаў, яго сапернік Караль Наўроцкі нібыта непрыкметна паклаў у рот нейкі пакецік, па яго словах, нікацінавы паўч. Грамадскасць апантана ўзбунтавалася, абвінавачваючы Наўроцкага ва ўжыванні псіхатропных рэчываў.

А без пяці хвілін беспрацоўны прэзідэнт Анджэй Дуда наогул прапанаваў кандыдатам здаць аналізы на забароненыя рэчывы. У выніку ні адзін з кандыдатаў не з'яўляецца прыкладам будучага добрапрыстойнага прэзідэнта. Так, эксперты ахрысцілі апошнія выступленні Наўроцкага і Тшаскоўскага «святам мярзоты, кпінаў, паклёпу і адкрытага хамства».

**Дэкан факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, палітолаг Аляксей БЯЛЯЕЎ** у эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» пракаментаваў сітуацыю на тэледэбатах наступным чынам:



— Нармальны палітык, які думае пра сябе, у якой бы залежнасці ні быў, напэўна, усё ж такі неяк бы паспрабаваў стрымацца. Тут мы бачым, што ў людзей наогул няма ніякіх тармазоў, уяўлення аб тым, як сябе павінен весці кандыдат у прэзідэнты на людзях. Плюс да гэтага выліваецца дадаткова вядро памыяў: знаходзяць кампрамат на таго ж Караля Наўроцкага — нібыта ён калісьці «крышаваў» прастытутак, вазіў іх камусьці ў атэль.

Эксперт звяртае ўвагу, што падобныя навіны з'яўляюцца пад маркай «надзейных, але ананімных крыніц, якія баяцца за сваю бяспеку».

— Потым, вядома, можа высветліцца, што ніякіх крыніц і не было і ўсё гэта нехта проста прыдумаў. Але хто будзе разбірацца падчас перадвыбарнай барацьбы? Цяпер галоўнае — замазаць свайго апанента ўсякім брудам.

Аляксей Бяляеў дадае, што скандалы, якія адбываюцца ў Польшчы, выдатна дэманструюць усю паўнату карціны аб «прыгожай» заходняй дэмакратыі.

— Што датычыцца рэйтынгаў, то там цяпер таксама ідзе знакамітая па еўрапейскіх дэмакратычных мерках вайна сацыялогій, — каментуе палітолаг. — Гэта значыць кожная сацыялагічная служба, набліжаная да той ці іншай палітычнай сілы, публікуе свае апытанні, дзе, зразумела, на карысць свайго прэтэндэнта спрабуе падтасаваць лічбачкі. Таму ідзе нармальная будзённая палітычная грызня, якая сёння для заходняй так званай дэмакратыі з'яўляецца нормай.


УНП 193734126

### ООО «СидНеА» организует конкурсные торги

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи/аренды) | Начальная цена: сумма в белорусских рублях, эквивалентная долларам США по курсу НБ РБ на день проведения торгов | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| **26.06.2025 10.00** | Продажа участка с кад. ном. 623686300601000002 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Самохваловичский с/с, д. Белица, участок № 1 | 7999 | 0,1551 га | 2500 | 90 |

### Повторные конкурсные торги

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи/аренды) | Начальная цена | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| **10.06.2025 10.00** | Продажа квартиры с инв. № 600/D-51637 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Папернянский с/с, д. Цнянка, ул. Армейская, д. 3, кв. 27 | 53000 | 50,8 кв. м | 2500 | 90 |
| **26.06.2025 11.00** | Продажа дома с кад. ном. 622283000003000022 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Путчинский с/с, СТ «ВЕРБНИКИ» | 39900 | 0,1112 га | 2500 | 90 |
| **10.06.2025 11.00** | Продажа квартиры с инв. № 600/D-52768 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, аг. Лесной, ул. Н.Н. Александрова, д. 6, кв. 41 | 61500 | 37,4 кв. м | 2500 | 90 |

Торги состоятся по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7-й этаж. Срок внесения конкурсного обеспечения и приема заявлений с прилагаемыми к нему документами прекращаются за один рабочий день до проведения торгов по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7-й этаж. Конкурсное обеспечение вноситься на р/с BY14MTBK30120001093300123688 в ЗАО «МТБанк», БИК (код) MTBKBY22. Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов. Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю. Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже (аренде) имущества ООО «СидНеА», утвержденными приказом директора от 05.03.2024 № 9-ОД. Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов. Телефон для справок (+37529) 171-50-50



### Извещение о проведении **12 июня 2025 года** повторных торгов на право размещения средств рекламы в лифтах многоквартирных жилых домов, расположенных во Фрунзенском районе г. Минска

| Место размещения средства рекламы (согласно поадресной инвентаризации лифтов*) | Вид средства рекламы (согласно техническому заданию) | Размер средств рекламы | Площадь рекламного поля, кв. м | Количество средств рекламы, единиц | Начальная цена предмета торгов (с учетом НДС) / сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Лифтовые кабины жилых домов, расположенные во Фрунзенском районе г. Минска | Антивандальный стенд (лифтборд) – 3 157 шт. | 594*420 мм (А2) – в лифтах грузоподъемностью до 400 кг | 0,25 | 2987 | 40 930,80 |
| | | 630*594 мм (6 А4) – в лифтах грузоподъемностью от 400 до 630 кг | 0,37 | 151 | |
| | | 841*594 мм (А1) – в лифтах грузоподъемностью 630 кг и выше | 0,50 | 19 | |

**Срок действия договора – 1 год** со дня подписания его сторонами без права продления.

**Уполномоченное лицо по управлению общим имуществом совместного домовладения –** коммунальное унитарное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска», г. Минск, ул. Матусевича, дом 42, пом. 1, тел. (017) 215-07-46.

**Организатор торгов** – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 360-42-22.

**Форма проведения торгов** – аукцион на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов на право размещения средств рекламы в лифтах многоквартирных жилых домов, утвержденным организатором торгов.

Аукционные торги проводятся **12 июня 2025 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 39, зал аукционов (каб. 7).

Документы на участие в торгах принимаются **с 28.05.2025 по 10.06.2025** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в торгах:** к участию в аукционных торгах допускаются лица, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:

– заявление на участие в торгах;

– копию платежного документа о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет организатора торгов;

– копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающих принять участие в торгах.

Сумма задатка (сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов) должна быть внесена по соответствующему предмету торгов не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583 (назначение платежа – задаток для участия в торгах на право размещения средств рекламы, назначенных на 12.06.2025).

Участнику, не ставшему победителем торгов (лицом, приравненным к победителю торгов), внесенный задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

**При подаче организатору торгов документов для участия в торгах и заключении соглашения представляются:**

физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность;

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом торгов организатор торгов проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в торгах. Заключительная регистрация представляет собой замену билетов участников торгов на аукционные номера, под которыми участники торгов будут участвовать в торгах. После проведения торгов участники обязаны вернуть эти номера организатору торгов.

**Порядок определения победителя торгов:** торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю торгов.

**Иные условия торгов:**

Победитель торгов (единственный участник торгов) обязан:

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** оплатить вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов;

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** перечислить на расчетный счет уполномоченного лица по управлению общим имуществом совместного домовладения сумму средств, за которую продан предмет торгов, за вычетом внесенной суммы задатка (цена продажи предмета торгов – стоимость услуг уполномоченного лица по управлению общим имуществом совместного домовладения по размещению рекламы в лифтах многоквартирных жилых домов, определенная по итогам торгов и уплачиваемая ежемесячно в соответствии с договором об оказании услуг по размещению рекламы);

- **в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов** заключить договор об оказании услуг по размещению рекламы с уполномоченным лицом по управлению общим имуществом совместного домовладения (при условии внесения платы за предмет торгов и перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов).

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

**Телефон для справок** (017) 360-42-22 – отдел аукционов (по вопросам организации и проведения торгов).

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Объявления – Аукционы»).

Дополнительная информация и поадресная инвентаризация лифтов* размещены на сайте организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции/Файлы).

ПРОСТАЯ МОВА

# МЫ ВЫБІРАЕМ, НАС ВЫБІРАЮЦЬ...

Пра новую лінію сталічнага метро мы, вядома ж, чыталі і чулі: ведалі, куды яна пракладзена, колькі станцый, на якой перасесці. А варта было апынуцца там і крыху разгубіліся — не туды скіравалі. Не мы адны, як аказалася:
— Не падкажаце, дзе пераход? — спыталі двое такіх жа заблудных. — А то ходзім тут як дурныя.
...Нешта новае, незнаёмае і сапраўды часцяком заганяе ў тупік: здаецца такім заблытаным! Але ж гэта — пакуль не пройдзеш хоць раз, ці не праедзеш і не ўбачыш — усё складанае проста.

## ЗРУЧНАЕ СЛОВА

Для таго каб жанчыну пакрыўдзіць розуму, шмат не трэба...

Сын, работа, камандзіроўкі — вячэра ў Алёны калі ёсць, калі не... Яна тады ў піцэрыю ходзіць — і дзень, і другі, і пяты...

У дзясяты — пасля перапынку зайшла, але ж быццам дадому: кухар ёй так шчыра ўсміхнуўся, так радасна «прапеў»:

— О-о, вы паправіліся?!

Сказаў як звязаў, як уцяў — па самым балючым месцы! Бо ёсць жа, ёсць і лішнія кілаграмы (шмат!), і гэтае старое аблезлае паліто...

— Не-не! Прабачце! — зразумеўшы промах, стаў адступаць мужчына. — Вы проста даўно не заходзілі. Я хваляваўся — думаў, захварэлі... А цяпер во, бачу, цудоўна выглядаеце, паправіліся...

Універсальнае слова: ім і пакрыўдзіць можна — да глыбіні душы, і... падбадзёрыць таксама.

## ВЫБАР

Наша, спаконвечнае: «Каб не ежка, не адзежка, была б грошай поўна дзежка». А вось з імі, з тымі «ежкамі-адзежкамі», і на донцы бывае няшмат.

Карцінка з рынку, як бы «пінпонг» — голас за прылавак:

— Пачым ваша сала?

Адтуль:

— 25 за кіло.



Малюнак Валянціна ГУБАРАВА «Чырвоная ружа — сімвал кахання».

Туды:

— Такое дарагое?!

Адтуль (амаль цішком, як жанчына жанчыне):

— Гэта не яно дарагое... Гэта ты, галубка, няўдала замуж пайшла.

— ?!

...І ведаеш, што магла б інакш!

І не ведаеш, ці трэба было?

## ДВОЕ

На работу Іванавіч сыходзіў рана: а палове сёмай. Загадзя ўставаў, збіраўся, ішоў у кухню, дзе яго ўжо чакала талерка з кашай, яешня ці блінкамі, кубак добрай гарбаты.

Не, ён не панскага роду — што-нішто мог «зварганіць» сам, але жонка лічыла, што спакой даражэйшы, чым гадзіна сну, а таму да свету ўставала, гатавала мужу снеданак, сачыла, каб добра адзеўся — абдымала яшчэ, з акна махала рукой.

І вось гэтак — сорак гадоў, амаль штодня!

Праўда, было, бо цяпер Іванавіч ужо не працуе, выйшаў на «дэмбель», на пенсію. А значыць, шмат што можа сабе дазволіць. Ну хоць бы паспаць — да паўдня.

Але ён па-ранейшаму рана ўстае, дапамагае жонцы паснедаць (разам смачней) і сабраца на работу, праводзіць на прыпынак, вечарам — сустракае.

Кажа, што спакой яму даражэйшы.

## ГЕНЫ

Без гасцей у хаце прасцей, толькі з імі — свята.

Мы доўга і як жа добранька пасядзелі за сталом: нагаманіліся, начаставаліся, папілі гарбаты; мы ўжо трохі прыбралі са стала і раздзяліліся: «хлопцы» са сваімі размовамі сышлі ў залу, «дзяўчаты» засталіся ў кухні, малое (адно, на жаль) шнуравала паміж.

— Занясеш бацьку мандарын? — пытаемся ў дачушкі.

Дзіця — ад слова, што называецца: бярэ, нясе, уручае:

— Бацька, на.

— І дзядзьку таксама занясі, — даручаем маленькай.

Дзяўчынка тут жа з мандарынам бяжыць у залу:

— Дзядзька, на.

...Ёй тры гадкі. Яна жыве ў Мінску, дзе ўсе амаль гавораць па-руску, яна ходзіць у звычайны (не беларускамоўны) садок. Ні цекаць, ні дзекаць дзіця ніхто не вучыў. Тады адкуль гэтыя мяккія «ц» і «дз»?

Прабабуля сказала б: «З урадА», ад прадзедаў, гены».

Максім Багдановіч: «Выціскаючы беларускую мову з школы, мы хілім да страты вынікаў велізарнай шматвяковай духоўнай працы цэлага народа, збіваем думку дзіцяці з натуральных псіхалагічных сцяжынак і губа аціаем ягоны душэўны свет».

## ЭСТАФЕТА

Вечар, трамвай: нам у ім пашчасціла сесці, трэцякласніку побач — стаць: прытуліўшыся да мамы, трымаючы на плячах яе цёплую руку, ловячы кожнае слова, кажучы нешта ў адказ...

Прыпынкаў з дзесяць вось так праехалі, на чарговым — з'явілася месца. «Мама, сядай!» — загадаў малы. «Не варта, сынок — нам хутка выходзіць», — запярэчыла тая. — «Але ж ты з работы, стамілася, — настойваў хлопчык. — Хоць трошкі ды адпачнеш».

...Гэтыя словы дзядуля малога, напэўна, казаў бабулі, яго бацька — маці: «Ребенок учится тому, что видит у сябя в дому».

І не толькі.

**Валянціна ДОЎНАР.**


· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by | |
| **Продавец** | ООО «ИКЛОН ИНВЕСТ», УНП 190712937, 211391, Витебская область, г. Орша, ул. Советская, 2В | |
| **Предмет публичных торгов (электронного аукциона)** | | |
| Лот, № | Наименование | Начальная цена, с учетом НДС 20 % |
| 1 | Капитальное строение (склад, производственный корпус) общей площадью 5 441,1 кв. м с инвентарным номером 500/С-32029, расположенное по адресу: 220075, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Селицкого, 9/6 | 1900,00 тыс. евро в эквиваленте по курсу Национального банка Республики Беларусь на день проведения торгов |
| **Задаток –** 3 % от начальной цены предмета электронного аукциона. В белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945 640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»** | | |
| **Шаг электронного аукциона** – 5 % от начальной цены лота | | |

| | |
|---|---|
| Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by | |
| **Срок подписания договора купли-продажи – 10 (десять) рабочих дней** после электронного аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронного аукциона – 20 (двадцать) рабочих дней** со дня заключения договора купли-продажи. **Переход права собственности** – после полной оплаты имущества | |
| **Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресам: https://iintorgi.by** | |
| Победитель электронного аукциона либо единственный участник, которому будет предложен для приобретения предмет электронного аукциона (претендент на покупку), обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 2 % от конечной цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения публичных торгов (аукциона) | |
| Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона) | |
| **Дата и время проведения торгов (аукциона):** 27.06.2025, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 28.05.2025 по 26.06.2025 г. до 17.00. Электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |


## Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| МІНСК | 754 мм рт.сл. | +14..+15°C / +17..+19°C |
| ВІЦЕБСК | 756 мм рт.сл. | +14..+15°C / +16..+18°C |
| МАГІЛЁЎ | 756 мм рт.сл. | +13..+14°C / +19..+21°C |
| ГОМЕЛЬ | 755 мм рт.сл. | +13..+14°C / +19..+22°C |
| ГРОДНА | 755 мм рт.сл. | +12..+13°C / +15..+18°C |
| БРЭСТ | 756 мм рт.сл. | +11..+12°C / +14..+18°C |

Паводле даных Белгідрамета

### Месяц

*Маладзік 27.05—02.06. Месяц у сузор'і Рака.*

### Геамагнітныя ўзрушэнні




### ...у суседзяў

МАСКВА +28..+30°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +20..+22°C



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## 28 МАЯ — Даты. Падзеі. Людзі

У краіне

**1836** год — нарадзіўся Ян Карловіч, лінгвіст, этнограф, фальклярыст, музыказнаўца. Сабраў і апублікаваў некалькі соцень беларускіх паданняў, казак, песень. Супрацоўнічаў з Міхалам Федароўскім, аўтарам шматтомнай працы «Люд беларускі».

**1894** год — нарадзіўся (в. Залядддзе, цяпер у Докшыцкім раёне) Франц Іосіфавіч Перховіч, генерал-лейтэнант, Герой Савецкага Саюза. Удзельнік Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Заходнім, Варонежскім, 1-м Украінскім, 1-м і 3-м Беларускіх франтах: камандзір палка, дывізіі, корпуса, камандуючы арміяй. Удзельнік абароны Масквы, вызвалення Украіны, Польшчы, Вісла-Одэрскай і Берлінскай аперацый.

**1959** год — нарадзіўся (в. Асмолава Навасіжскага раёна) Сяргей Антонавіч Чыжык, беларускі вучоны ў галіне фізікі і механікі паверхняў на мікра- і нанаўзроўні, нанадыягностыкі. Акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар. Пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле выканана распрацоўка і ўпершыню з 1994 г. наладжана вытворчасць айчынных атамна-сілавых мікраскопаў серый «Нанатоп» і «Нанатэстар», якія выкарыстоўваюцца ў дзясятках навуковых і заводскіх лабараторый Беларусі, а таксама пастаўляюцца за мяжу.

У свеце

**1779** год — нарадзіўся Томас Мур, песеннік і аўтар балад. Адзін з асноўных прадстаўнікоў ірландскага рамантызму. Найбольш вядомыя яго творы — «Апошняя ружа лета» і зборнік «Ірландскія мелодыі».

**1871** год — пасля тыдня крывавых баёў разгромлена Парыжская камуна, палі апошнія яе апоры — парк Бют-Шамон і могілкі Пер-Лашэз. Абаронцы былі акружаны і абяззброены. Апошнія 147 чалавек, якія змагаліся за Пер-Лашэз, расстраляны салдатамі раніцай 28 мая каля паўночна-ўсходняй сцяны могілак (цяпер гэта месца вядомае як Сцяна камунараў і служыць сімвалам мужнасці і стойкасці).


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай — 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 951 Індэкс 63850. Зак. № 1057.

Нумар падпісаны ў 19.30 27 мая 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12